СТУДЗЕНЬ 21 НЯДЗЕЛЯ № 3 (459) 1940 год Цана 20 кап.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР.



Владзімір Ільіч Ленін. Малюнак мастака Н. Гурло.

ВОБРАЗЫ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ТВОРАХ ЛЕНІНА

У сваіх творах, артыкулах, дакладах, выступленнях Владзімір Ільіч Ленін шырока выкарыстоўваў вобразы рускай літаратуры.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што Ленін поўнасцю змяняе сэнс мастацкага вобраза, створанага пісьменнікам, што ў Леніна ён выступае ў зусім новым значэнні, што Ленін уносіць у вобраз абсалютна новыя рысы, што вобраз, створаны пісьменнікам, у ленінскім тэксце набывае поўную метамарфозу.

Праанаалізіраваўшы скарыстанне літаратурных цытат, мастацкіх вобразаў у творах Леніна і Сталіна, мы ўбачым, што і Ленін і Сталін не мяняюць сэнсу мастацкага вобраза, а выкарыстоўваюць яго ў розных умовах па-рознаму, даючы пры гэтым выключна глыбокую і вычарпальна тонкую характарыстыку створанага пісьменнікам вобраза. Вобраз не мяняецца, а толькі правільна трактуецца. Ды няма і патрэбы мяняць яго бо ўся сіла выкарыстання Леніным і Сталіным мастацкага вобраза ў тым і заключаецца, што ён выклікае ў памяці чытача карціннае, канкрэтна-пачуццёвае адчуванне, асацыяцыйнае супастаўленне, якое ўзмацняе вайстрыню ленінскіх і сталінскіх выказванняў у кожным палобным выпадку. Змяняецца ў залежнасці ад абстаноўкі выкарыстанне вобраза, ён паварачваецца пэўным новым бокам, ярчэй вылучаецца пэўны бок мастацкага вобраза, акцэнтыруецца пэўная рыса яго, неабходная ў даным выпадку.

Ленін і Сталін часта паварачваюць мастацкі вобраз да чытача тым бокам, які чытач толькі заўважыў ці слаба адчуў пры чытанні мастацкага твора, а ў працах Леніна і Сталіна ён асвятляецца яркім святлом і зноў ажывае.

Іменна ў гэтым другое важнае значэнне вывучэння выкарыстання мастацкіх вобразаў класікамі марксізма.

Выступаючы супроць Петрункевіча, які, выражаючы імкненні ліберальна-манархічнай буржуазіі, выступіў з прапаведдзю шкоднасці рэвалюцыйнага паўстання супроць царызма, Ленін параўноўвае яго з вядомым гогалеўскім персанажам з «Мёртвых душ»—Маніламвым. Удалае параўнанне адразу зрывае маску манілаўскай дабрадушнасці, якую надзеў на сябе Петрункевіч, каб красамоўствам аб аркадскай ідыліі ўсыпіць і адвесці масы ад паўстання, даўшы гэтым самым магчымасць буржуазіі «мірна» ўзяць уладу ў свае рукі. «Цяжка ўявіць сабе што-небудзь больш агіднае, як гэтага ідэолага баязлівай буржуазіі,—піша з гэтай прычыны Ленін у артыкуле «Байкот Булыгінскай думы і паўстанне»,—які ўпэўнівае, што прапаведзь паўстання «дэмаралізуе» і армію і народ! Гэта гаворыцца ў такі час, калі сляпыя бачаць, што толькі паўстаннем можа рускі абывацель і салдат выратаваць сябе ад канчатковай дэмаралізацыі і паказаць сваё права быць грамадзянінам! Буржуазны Манілаў высуе сабе аркадскую ідылію, як пад ціскам адной толькі «грамадскай думкі» «урад будзе вымушан рабіць усё новыя і новыя ўступкі, пакуль, нарэшце, яму не будзе куды ісці далей...»

Далей Ленін прадаўжае: «Засланяць лозунг паўстання, адгаварвацца ад яго і адгаварваць іншых, раіць у выглядзе «пралогу» безадкладную арганізацыю самакіраўніцтва (зручную толькі Трубецкім, Петрункевічам, Фёдаравым і К°).—гэта іменна тое, што патрэбна для буржуазнага здрадніцтва рэвалюцыі, для здзелкі з царом (манархія і верхняя палата) супроць «чэрні». Ліберальная манілаўшчына выражае таму самыя патаемныя мыслі грашовага мяшка і яго найглыбейшыя інтарэсы».

Пры дапамозе вобраза, створанага Гогалем, Ленін поўнасцю развенчвае дзеянні ворага. Апрача таго, Ленін дапамагае правільна ўсгрымаць мастацкі вобраз дае меткую трактоўку яго. Владзімір Ільіч Ленін усюды, як бачым, падкрэслівае, што асноўнай рысай Манілава з'яўляецца лёгкая і пустая прыкрасаладжавая фраза, якая ў розныя гістарычныя перыяды і ў розных прадстаўнікоў варожых працоўным класаў і груп па-рознаму выкарыстоўваецца. Іменна асноўнае ў вобразе Манілава, створанага Гогалем, і выкарыстоўвае Ленін, выкрываючы ворага, і выкарыстоўвае для таго, каб пры дапамозе асацыяцыйнага параўнання больш выразна паказаць твар ворага.

Ленін паказвае, што салодзенькія ружовыя мары, не маючыя пад сабою рэальнай глебы, неперыўны паток ліпкіх і цягучых, як патака, слоўцаў у гогалеўскага Манілава, што сядзіць у сваім маёнтку, нікому нічога дрэннага не прыносяць. Праўда, гэта была своеасаблівая форма прыкрыцця жахаў прыгонніцтва, але сам Манілаў не разумеў гэтага. А калі ўвесь гэты комплекс натуры Манілава пераносіцца на арэну палітычнай барацьбы, на шырокае поле грамадскага жыцця, ды яшчэ свядома выкарыстоўваецца, то ўсё гэта робіцца максімальна шкодным, бо пад маскай дабрадушнага Манілава хаваецца твар драпежніка. Але хіба гэта змяненне гогалеўскага вобраза? Хіба гэта новы вобраз з новымі якасцямі, адрознымі ад якасцей гогалеўскага Манілава? Не. Гэта раскрыццё новай з'явы праз старое агульнавядомае паняцце, якое даўно ўжо ўстаялася, гэта зрыванне авечай шкуры з ваўка пры дапамозе мастацкага вобраза, выкліканага з мінулага.

Вобраз натхнёнага хлуса Хлестакова знаходзіць сваё прыстасаванне ў ленінскіх працах, накіраваных сваім лязом супроць новай «Искры». Часта новая «Искра», спрабуючы паказаць, што рабочыя падтрымліваюць меншавікоў, выдавала за існуючыя такія рабочыя саюзы, якія існавалі толькі ў яе хваравітым ўяўленні. І Ленін вельмі едка заўважае, што гэтыя меншавіцкія рабочыя саюзы «існуюць часта толькі на старонках хлестакоўскай «Искры». Такая заўвага, як-бы выпадкова кінутая Леніным, наносіць сакрушальны ўдар не толькі хвастаўлівай меншавіцкай новай «Искры», але і натхнёнай хлусні меншавіцкіх Хлестаковых. Літаратурнае параўнанне тым мацна, што выклікае ў чытача вобразнае ўяўленне, у даным выпадку смешнае становішча беззапаможнага хлуса, які заддаўся да немагчымасці. Падобнае параўнанне абяззбройвае ворага, забівае яго сілай смеху.

Больш сотні разоў выкарыстоўвае Ленін у сваіх працах вобразы, створаныя Гогалем. Яшчэ больш знаходзім мы ў Леніна салтыкова-шчэдрынскіх цытат, вобразаў, параўнанняў. Звыш трохсот разоў сустракаюцца яны ў творах Леніна.

Неаднаразова звяртаецца Ленін да вобраза Іудушкі Галаўлёва, гэтага найбольш моцнага вобраза ў сатырычнай галерэі Салтыкова-Шчэдрына. Іудушка паказан Шчэдрыным, як гранічнае выражэнне крывадушнасці, ён здольны тварыць самыя злачынныя, самыя брудныя ўчынкі. Свае злачынныя дзеянні Іудушка прыкрывае моташнымі елейнымі разважаннямі, набожнасцю. Салтыкоў-Шчэдрын паказаў, як з-пад маскі «святасці» выглядваюць клыкі страшыдла, народжанага эксплаататарскім грамадствам.

Ленін ускрыў усю глыбіню гэтага вобраза, выкарыстоўваючы яго, як спосаб развенчвання ворага, як вострую зброю, што знішчае працаўніка. Ленін паказвае Іудушку ў новай гістарычнай абстаноўцы. Іудушка — ліберальны журналіст, Іудушка—земскі дзеяч, Іудушка—меншавік, Іудушка—відны «тэарэтык» здрадніцкага II Інтэрнацыянала. У розных умовах, у рознай вопратцы, у розны час—гэта ўсё адзін і той-жа елейны здраднік, які поўзае перад капіталізмам, гэта—двурушнік з «узвышанымі» мёдапечнымі словамі на вуснах, дробны драпежнік па сваёй прыродзе, заўсёды гатовы на самыя брудныя ўчынкі.

Ленін навекі заклаймаваў прэзрэннай мянушкай Іудушкі обербандыта, злейшага ворага народа Троцкага, навекі прыгваздзіў яго пры дапамозе шчэдрынскага сатырычнага вобраза да ганебнага слупа.

Вось як характарызуе Ленін Іудушку. У артыкуле «Што такое прыяцелі народа», паказваючы сапраўдны твар «айчыннай бюракратыі», «што мяркуе высокую задачу ў спалучэнні інтарэсаў памешчыка і буржуа», Ленін піша: «Гэта—Іудушка, які карыстаецца сваімі прыгонніцкімі сімпатыямі і сувязямі для ашукання рабочых і сялян, праводзячы пад выглядам «аховы эканамічна слабога» і «апекі» над ім у абарону ад кулака і ліхвяра такія мерапрыемствы, якія нізводзяць працоўных да становішча «подлай чэрні», аддаючы іх з галавой прыгонніку-памешчыку і робячы тым больш безабароннымі супроць буржуазіі. Гэта—самы небяспечны двурушнік, які ўмудрон вопытам заходне-еўрапейскіх майстроў рэакцыі і спрытна хавае свае аракчэеўскія імкненні пад фігавыя лісткі народалюбівых фраз».

Іудушка—гэта смяротны вораг працоўных, і тым больш небяспечны і агідны, што схаваў свой сапраўдны твар «пад фігавыя лісткі народалюбівых фраз». І калі Ленін выкарыстоўвае стары вобраз для характарыстыкі новай з'явы, то ён спецыяльна агаворвае тое, як старыя якасці, не мяняючыся ў сваёй аснове, узмацняюцца адносна, так сказаць, вопыту, набытага ворагамі ў справе ашукання народа. І вось перад намі паяўляецца салтыкова-шчэдрынскі Іудушка, але ён ужо «умудрон» «вопытам заходне-еўрапейскіх майстроў рэакцыі». Гэта той-жа Іудушка з «Паноў Галаўлёвых», але яшчэ больш небяспечны, яшчэ больш агідны, бо карыстаецца «удасканаленымі» сусветнай буржуазіяй прыёмамі крывадушнасці.

Лібералаў, якія хапаюцца за фалды вялікага сатырыка Салтыкова-Шчэдрына, Ленін паражае смерцяноснымі радкамі сатыры таго-ж Салтыкова-Шчэдрына. І з якім выключным публіцыстычным майстэрствам гэта зроблена, з якой геніяльнай вынаходлівасцю выканана гэта! «Асабліва пясцерпна бывае бачыць, калі суб'екты, накшталт Шапецева, Струве, Гродэскула, Ізгоева і іншай кадэцкай брацці, хапаюцца за фалды Некрасава, Шчэдрына і г. д... Шчэдрын бязлітасна здзекваецца над лібераламі і назаўсёды заклаймаваў іх формулай: «прыстасоўла к подласці».

Вельмі часта звяртаецца Ленін да народнай мудрасці, якая знайшла сваё бліскучае ўвасабленне ў крылоўскай байцы, каб ёю больш рэльефна вылучыць пэўны факт соцыяльнага жыцця. Вельмі часта В. І. Ленін едкай крылоўскай сатырай разіў ворага, зрываў авечую шкуру з ваўка. Звернемся да некалькіх прыкладаў. Выключна ўдала накіраваў Ленін лязо крылоўскай сатыры супроць капіталістаў і царскай улады, сфабрыкаваўшых новы закон, якім спрабавалі замаскіраваць нечуваную эксплаатацыю рабочых: «Узятыя разам, усе гэтыя правілы аб звыштэрміновай рабоце здзіўляюча нагадваюць вядомую байку аб тым, як леў дзяліў «пароўну» здабычу паміж сваімі сябрамі па паляванню: першую частку ён бярэ сабе па праву; другую частку за тое, што ён цар звяроў; трэцюю—за тое, што ён за ўсіх сільнейшы, а к чацвертай—хто лапу працягне, той з месца жывы не ўстане».

Неаднаразова можна сустрэць у ленінскім тэксце прыказкі, узятыя з баек Крылова. Цікава разглядзець, як Ленін ажыўляе, завайстрае накіраванасць пагаворкі, прыказкі, канкрэтызіруючы яе прозвішчам ворага, супроць якога накіравана яе лязо. Напрыклад, у вядомай прыказцы з байкі Крылова «Пустыннік і мядзведзь»—«Услужлівы дурань небяспечней ворага»—Ленін замест другога слова падстаўляе прозвішча і тады прыказка метка і навекі прыклейваецца да ўласніка якасцей, выражаных прыказкай. Вось, напрыклад, прыказка з падстаўленым прозвішчам: «Услужлівы Троцкі небяспечней ворага». І тут-жа даецца паглыбленае растлумачэнне гэтай характарыстыкі, абагульненне паводзін Троцкага: «Ні адкуль, як з «прыватных гутарак» (г. зн. папросту му плётак, якімі заўсёды жыве Троцкі), ён не мог запазычыць доказаў...»

Так пад пяром Владзіміра Ільіча Леніна ажывае крылоўская сатыра, становячыся на службу барацьбы з ворагамі народных мас.

Неаднаразова сустракаюцца ў артыкулах і дакладах Леніна вобразы мастацкіх твораў Пушкіна, Некрасава, Ганчарова, Чэхава і іншых класікаў рускай літаратуры. Кожны раз вобраз, не змяняючыся ў сваёй сутнасці, а толькі ўзбагачаючыся новымі рысамі, выкарыстоўваецца як вострая і дзейсная зброя ў барацьбе за ідэі партыі і рабочага класа.

А. ТРЫПОЛЬСКІ.

ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ

Над совецкай зямлёй палымнее сонца соцыялізма. Яно асвятліла шырокі шлях будучыні. Вялікі Ленін і мудры прадаўжальнік яго справы Сталін запалілі гэта сонца. І па сонечнаму ленінскаму шляху вядзе Сталін народы соцыялістычнай краіны да поўнай урачыстасці комунізма.

16 год прайшло з дня, калі перастала біцца агністае сэрца вялікага правадыра чалавецтва Владзіміра Ільіча Леніна. Яго няма сярод нас. Але ідэі і справы Леніна бессмяротны.

У ззяючай славе здабытага шчасця — збудаванага соцыялізма ў краіне Советаў, яна нязгасным пуцяводным маяком высіцца над усім светам, — бессмяротнасць Леніна.

У велічы спраў совецкага народа — будаўніка комунізма, у сталёвым адзінстве і магутнай сіле большавіцкай партыі, у завяршэнні вялікіх ленінскіх спраў геніем Сталіна — бессмяротнасць Леніна.

У шчырай радасці дзіцяці і шчасці маці, у натхнёных дзярзаннях юнака, у пераможнай яснасце шляху народаў сталінскай зямлі — бессмяротнасць Леніна.

Пройдуць вякі, зменяцца пакаленні, а імя і вобраз Леніна будуць, як сёння, ззяць у промнях нязгаснай славы, бо неўміруча справа, якой Ленін аддаў свой творчы геній, сваё жыццё, — комунізм.

Вялікую клятву высока трымаць і непахісна несці наперад сцяг Леніна даў ад імені партыі таварыш Сталін. Ён пакляўся захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі; ахоўваць адзінства партыі, як зяніцу вока; ахоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята; умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян; умацоўваць і пашыраць Саюз Рэспублік; умацоўваць і пашыраць саюз працоўных усяго свету — Комуністычны Інтэрнацыянал.

Няўхільным выпаўненнем гэтай сталінскай клятвы ўшаноўвае большэвіцкая партыя, совецкі народ памяць свайго вялікага настаўніка В. І. Леніна.

У ленінскай чыстаце захавана званне члена большэвіцкай партыі. Гэта ганаровае званне заваёўваюць лепшыя сыны і дочкі совецкага народа адданай працай на карысць сваёй соцыялістычнай радзімы.

Партыя Леніна— Сталіна разграміла і выкарчавала ўсіх ворагаў народа і стала сталёва-маналітная, гранітна-непахісная, пад кіраўніцтвам Сталіна пабеданосна вядзе совецкі народ па ленінскаму шляху.

Усё больш і больш умацоўваецца дзяржава дыктатуры пролетарыята — совецкая дзяржава, завяршыўшая зараз на аснове Сталінскай Канстытуцыі перабудову ўсіх сваіх органаў улады.

Непахісны саюз рабочых і сялян дасягнуў найвялікшага развіцця — ператварыўся ў магутнае маральна-палітычнае адзінства ўсяго совецкага народа, згуртаванага пад сцягам Леніна і Сталіна.

Няспынна расце і мацнее вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Ярка квітнее братняя сям'я аднапаці совецкіх рэспублік, дзівосна ператварыўшых сваё аблічча за гады сталінскіх пяцігодак, збудаваўшых сваю прамысловасць, калгасную гаспадарку, высока ўзняўшых сваю соцыялістычную культуру. Расце і мацнее сталінская дружба народаў.

Няспынна, з года ў год, расце магутнасць Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота — грознай і непераможнай сілы совецкага народа. З іменем Леніна і Сталіна гераічныя сыны радзімы — байцы Чырвонай Арміі—выпаўнілі вялікую місію вызвалення нашых братоў-беларусаў і ўкраінцаў з-пад іга польскіх паноў і бліскуча выпаўняюць сваю ролю вызваленцаў працоўных зараз, у барацьбе з белафінскімі бандамі.

А на Захадзе гарыць пажарышча вайны, распаленае імперыялістамі Англіі і Францыі. Але не знойдзе капіталізм выйсця ў вайне. Прыйдзе час, а ён недалёка, калі пролетарыят назаўсёды парве капіталістычныя ланцугі.

Свяшчэнна, няўхільна выпаўняецца сталінская клятва.

Цвёрда і ўпэўнена ідзе пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна па ленінскаму шляху совецкі народ. І вобраз Леніна, які жыве ў сэрцы і пачуццях совецкага народа, кліча наперад. Быць як Ленін — вучыць вялікі правадыр народаў таварыш Сталін.

Быць дзеячом ленінскага тыпу — актыўным будаўніком комунізма — значыць:

быць такім-жа ясным і пэўным дзеячом, як Ленін;

быць такім-жа бясстрашным у баю і бязлітасным да ворагаў, якім быў Ленін;

быць гэтак-жа свабодным ад усякага падабенства панікі, як быў свабодным Ленін;

быць гэткім-жа мудрым і непаспешлівым пры вырашэнні складаных пытанняў, якім быў Ленін;

быць гэткім-жа праўдзівым, чэсным, якім быў Ленін;

гэтак-жа любіць свой народ, як любіў яго Ленін.

Гэта мудрае вызначэнне в класічнай паўнатой акрэслівае вобразы найвялікшых геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна. І яно, гэта вызначэнне, дае ясны шлях распрацоўкі вобразаў вялікіх правадыроў народа Леніна і Сталіна ў творах літаратуры і мастацтва.

Авалодваючы марксізмам-ленінізмам, нашы пісьменнікі, работнікі мастацтваў дасягаюць усё новых і новых поспехаў у справе паказу ў літаратуры, у кінематаграфіі, у тэатральным і выяўленчым мастацтвах вобразаў Леніна і Сталіна. Гэтыя сур'ёзнейшыя і ганаровейшыя творчыя задачы вырашаюцца і ў нашай рэспубліцы, — мастакі рыхтуюць выстаўку дзе будзе адлюстравана роля Леніна і Сталіна ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці; распрацоўку вобразаў вялікіх правадыроў пачынаюць пісьменнікі, работнікі тэатра і іншых галін мастацтва Совецкай Беларусі.

Тварцом росквіту творчых сіл, шчаслівага жыцця, гістарычных перамог 183-мільённага совецкага народа, правадыром гераічнай партыі большэвікоў, вялікім прадаўжальнікам справы Маркса—Энгельса—Леніна з'яўляецца таварыш Сталін. «За апошнія гады, з таго часу, калі мы працуем без Леніна, мы не ведаем ні аднаго павароту ў нашай рабоце, ні аднаго колькі-небудзь буйнага пачынання, лозунга, напрамку ў нашай палітыцы, аўтарам якога быў-бы не таварыш Сталін, а хто-небудзь іншы... Магутная воля, велізарны арганізатарскі талент гэтага чалавека забяспечылі партыі своечасовае правядзенне вялікіх гістарычных паваротаў, звязаных з пабеданосным будаўніцтвам соцыялізма», — гэтыя натхнёныя словы С. М. Кірава мудра выражаюць агульную думку ўсёй партыі і ўсяго совецкага народа, поўных гарачай сыноўняй любві да свайго бацькі і настаўніка — вялікага Сталіна.

Сталін — гэта Ленін нашых дзён. Пад яго вадзіцельствам народы Совецкага Саюза пабеданосна ідуць па ленінскаму шляху — шляху комунізма.



Выступленне В. І. Леніна на Красавіцкай канферэнцыі 1917 года. Малюнак мастака П. Васільева.

Г. БЯРОЗКІН

ЛЕНІН У ПАЭЗІІ МАЯКОЎСКАГА

Першыя вершы Маякоўскага аб Леніне адносяцца да 1922 года. У гэтым годзе Маякоўскі напісаў верш «Владимир Ильич», якім шчыльна наблізіўся да вялікай ленінскай тэмы. Але, як гэта часта здаралася ў Маякоўскага,—рад тэм, якія ўставалі перад паэтам у яго новы, савецкі перыяд, быў лірычна падрыхтаван яго дарэвалюцыйнай паэтычнай творчасцю. Цэлы рад заданняў рэвалюцыйнай эпохі, якія вырасталі перад Маякоўскім у парадку асэнсаванай і строгай дысцыпліны «агітпропа», знаходзілі для сябе арганічнае сцвярджэнне і велізарную колькасць лірычных «загатовак» у раней накопленым дарэвалюцыйным вопыце паэта. Так, напрыклад, тэма новага мастацтва, пастаўленага на службу пралетарскай рэвалюцыі, — хіба не была яна падрыхтавана ўсім дэмакратычным характарам дарэвалюцыйнай работы Маякоўскага? Тут ёсць безумоўная сувязь і праемственасць матываў, што ўказвае на арганічнасць творчага развіцця паэта, і гэту арганічнасць лішні раз пацвярджае прапятлая работа Маякоўскага па авалоданню ленінскай тэмай.

Гаворачы аб бесперапыннасці творчага развіцця Маякоўскага, трэба не забываць аб тым велізарным, ні з чым не параўнаным уплыве, які мела Кастрычніцкая рэвалюцыя на творчасць Маякоўскага. Іменна яна надала партыйную мэтанакіраванасць усёй паэтычнай рабоце Маякоўскага, ператварыўшы ўнутраны свет яго вершаў з свету трагедыі ў свет жыццесцвярджаючых страсцей і пачуццяў. Але Маякоўскі — гуманіст, перакананы вораг буржуазнай «цывілізацыі», найвялікшы майстар, які адчуваў свет у яго першапачатковай навізне і непасрэднасці, быў гатовы ўсёй сваёй істотай сустрэцца з сацыялістычнай рэвалюцыяй, з занава перааформляючымся светам. Аб гэтым лішні раз сведчыць факт наяўнасці ў дарэвалюцыйнай паэзіі Маякоўскага цэлага рада такіх тэм, якія поўным голасам назвала толькі рэвалюцыйная эпоха.

Маякоўскі напісаў свой першы верш аб Леніне ў 1922 годзе. З таго часу ён з гэтай тэмай не разлучаўся. Для Маякоўскага Ленін быў перш за ўсё ўвасабленнем сацыялізма, правадыром і надзеяй прыгнечаных мас. У Леніне гісторыя робіць свой «ад рабства дзесяці тысячагоддзяў да вякоў камуны бліскучы перавал». Адыходзіць у мінулае несправядлівейшы з законаў — закон, па якому людзі вырабляюць найвялікшыя каштоўнасці, ставячыся і ўпадабляючыся бясплатку. Недарэчнасць і абураючую беззаконнасць такога становішча Маякоўскі адчуваў з незвычайнай вастрынёй. У сваіх дарэвалюцыйных бунтарскіх рэчах ён прадказаў гібель капіталістычнага грамадства. Але, застаючыся па-за сферай прамых палітычных баёў пралетарыята, Маякоўскі не мог звязаць матываў страснага адмаўлення «капитала—его препохабие» з свядомай калектыўнай барацьбой рабочага класа. Ён верыў у прыход «тринадцатого апостола», моцнага чалавека — «весь из мяса», — які найвялікшым актам самаафяравання выратуе чалавецтва. Часцей за ўсё гэты вобраз, звеяны мучыцельным апостальствам, набываў рысы і аблічча самога паэта, героя яго асабістай «біяграфічнай» лірыкі. Ва ўсякім выпадку, Маякоўскі верыў, што ў нетрах здрабнелага грамадства расце незвычайная сіла, чалавек, акрыўлёную душу якога, як сцяг, узнімуць паўстаўшыя рабы.

Ад гэтага чалавека—«апостала» яшчэ так далёка да Леніна, як ад трагічнай, разарванай свядомасці, увасобленай у першых вершах Маякоўскага, далёка да акрэсленай палітычнай установкі спелых твораў лепшага і таленавіцейшага паэта савецкай эпохі. Але сам па сабе факт звароту Маякоўскага да тэмы бунту, увасобленага ў чалавеку-вызваліцелю, чалавеку-смельчаку, у многім сімптаматычны. Паэт бачыў абураючыя супярэчнасці капіталізма. Ён з вялікім болем перажываў чалавечыя пакуты. Ён бачыў чалавека — афяру гісторыі, а хацеў бачыць чалавека — тварца гісторыі. Яму здавалася, што калі Пётр Вялікі сыйдзе з свайго каня і паспрабуе прайсці па пецербургскіх вуліцах, натоўп яго заганіць з гіканнем і свістам, таму што сучасны Пецербург не прызнае вялікіх... У такіх умовах яго — паэтава — мара аб чалавеку натуральна прымала акрэслена ваяўнічы характар. Яна жывілася рэвалюцыйнымі сокамі нязгоды і пратэсту супроць існуючага парадку. У ёй сказаўся найвялікшы гуманістычны пафас паэта, які праз «горы времени» убачыў няясныя контуры «коммунистического далеко» і, убачыўшы, усёй сваёй істотай звярнуўся да яго:


Он
свободный,
Ору о ком я,
человек —
придет он,
верьте мне,
верьте!

Вышэйшым увасабленнем новага вызваленага чалавецтва з'явіўся для Маякоўскага Уладзімір Ільіч Ленін. Апяваючы Леніна, Маякоўскі выражаў «мира веру и веру свою». Ён бачыў у Леніне ўвасабленне ўсвядомленых і разумных законаў гісторыі, якая зараз, з перамогай сацыялістычнай рэвалюцыі, перастала быць варожым чалавеку «лёсам», «фатумам». Для таго, каб чалавек рухаў наперад прагрэс, развіццё гісторыі, яму няма патрэбы адмаўляцца ад уласцівых сабе чалавечых рысаў і якасцей. У гэтым і заключаецца жывая дыялектыка паказу Леніна Маякоўскім.

Ленін — правадыр, геній, прарок сацыялістычнай рэвалюцыі, і адначасова, Ленін — «самый земной з усіх прайшоўшых на зямлі людзей». Маякоўскага прыводзіць у ярасць сама мяркуемая магчымасць цукеркавага ўпадаблівання нашага Ільіча да забронзавеўшых «геніяў», да вычытаных з кніг «прарокаў».

Не, каб быў ён
быццам цар і бог узнесены,
Я ад злосці
загарэўся-б скрозь,
Я устаў-бы
напярэд працэсій,
пакланенням
і натоўпам насупроць.
Але цвёрды
крок Дзяржынскага...

І смутак па-чалавечаму просты, і боль па-чалавечаму знаёмы. Ленін — просты і вялікі ў сваёй прастаце чалавек. Такім яго ўбачыў Маякоўскі і такім яго запячатлеў у сваёй неўміручай паэме.



В. І. Ленін за работай. Скульптура Н. Андрэева.

Калі Маякоўскі прыступіў да работы над гэтай паэмай (1923—24 годы), у савецкай паэзіі амаль зусім адсутнічалі творы аб Леніне. Усведамленне незвычайнай цяжкасці і адказнасці адпужвала многіх паэтаў. Рабочы паэт Н. Палетаеў выразіў мысль, што паэтычны партрэт Леніна дадуць вякі — «века уж дорисуют, видно, недорисованный портрет».

Маякоўскі — «сегодняшних дней убежденный житель» — не мог згадзіцца з падобнай «апеляцыяй» да вякоў. Ён не мог каму-б там ні было перадаручыць нябачанага гонару задачу паказаць Ільіча. Ён сам прыступіў да выканання гэтай задачы, праб'ваючы сабе шлях скрозь ланцугі змрочных незычліўцаў, ворагаў і скептыкаў.

У халодны студзеньскі дзень 1924 года Маякоўскі ішоў за трунай Ільіча, каб, прыйшоўшы дадому, прымусіць страфу прарабіць той-жа марш з Дома Саюзаў да плошчы, дзе спіць Ільіч. І цяпер, перачытваючы апошнія часткі паэмы, мы, аддалёныя гадамі ад тых студзеньскіх дзён, адчуваем усю глыбіню чалавечага смутку, увесь боль развітання, якім жыў народ у тыя памятныя дні. Апошняя мінута развітання з Ільічом, мінута маўчання над трунай правадыра, громам аддае ў свядомасці чытаючага паэму Маякоўскага, — такая сіла пачуцця ўвасоблена ў гэтых вершах! Жывым ітогам ленінскага жыцця праходзяць тры пакаленні ленінцаў. Этап за этапам, год за годам праходзіць перад чытачом ленінскае жыццё, безупынна звязанае з жыццём краіны, з жыццём партыі.

Маякоўскі невыпадкова абраў жанр хранналагічнай паэмы, якая разв'ваецца суадпаведна з строгай гістарычнай паслядоўнасцю падзей, таму што такая форма давала паэту поўную магчымасць звязаць ленінскую тэму з тэмай развіцця пралетарыята, яго выспявання, яго барацьбы і дзейнасці. Маякоўскі ведаў, што сіла Леніна ў яго адзінстве з народам, з класам і што, абышоўшы ў сваім паэтычным паказе гэты момант, паэт тым самым пазбавіць Леніна яго найбольш характэрнай сутнасці. Так, у рэзультаце свядомага выбару паміж жанрамі Маякоўскі спыніўся на форме публіцыстычнай паэмы. Цяжкасці гэтага жанру Маякоўскі ўсвядоміў вельмі добра. У сваёй аўтабіяграфіі ён пісаў наступнае: «1924 г. Закончыў паэму «Ленін». Чытаў на многіх рабочых сходах. Я вельмі баяўся гэтай паэмы, бо лёгка было знізіцца да простага палітычнага пераказу. Адносіны рабочай аўдыторыі ўзрадавалі і ўцвярдзілі ва ўпэўненасці ў патрэбнасці паэмы».

Паставіўшы ў цэнтры паэмы вобраз Леніна—чалавека, правадыра, натхніцеля і арганізатара кастрычніцкіх баёў, Маякоўскі адлюстраваў у ёй і тыя гістарычныя ўмовы, якія папярэднічалі паяўленню генія сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэта карціна Расіі прыгоннай, капіталістычнай, агорнутай полымем пралетарскага паўстання, складае адзінае цэлае. Гэта не «простой политический пересказ событий», а адзіная, агорнутая лірычным пафасам, паэтычная карціна. У гэтай карціне вельмі шмат асабістага—«ад паэта», ад яго адносін да тэмы. Як на прыватную, але вельмі цікавую дэталь можна ўказаць на такія радкі аб старой прыгоннай Расіі:

Былі краіны,
багатыя болей,
прыгажэйшыя бачыў
і разумней.
Але зямлі
з яшчэ большым болем
не давялося
бачыць
мне.

Аматарам сцвярджаць, быццам Маякоўскі не быў рускім паэтам, быццам у яго за плячыма стаяла толькі касмапалітычная схема, параім часцей звяртацца да гэтых вершаў. У іх ёсць сэрца спіскаючы да болю смутак аб Расіі, спаласаванай дубцамі, пасінеўшай «как река весной». Тым мацней гучаць у апошніх частках паэмы радкі аб Леніне:

Зямлю
загадаў ён
назваць сваёй,
што ў трунах
дзядам закатаваным сніцца.

Ствараючы сваю паэтычную карціну, якая ўваходзіць каранямі ў глыб стагоддзяў, Маякоўскі адначасова выражае шматвяковую мару народа, увасобленую ў Леніне,—мару аб будучым. Гэта і яго паэтычная мара, якая яшчэ гучала ў «Облаке в штанах», у паэме «Война и мир». Адсюль, з усведамлення безупыннай злітнасці з «классом — громадой» нарадзілася здзіўляючая лірычнасць і цэласнасць паэмы «Ленін». Смерць Леніна прымусіла паэта яшчэ раз з новай сілай адчуць сябе нязд'емнай часткай змагаючагася чалавецтва.

Я частка той сілы,
і мне ганарыцца,
што слёзы агульныя
нават у нас.
Няма як
мацней і чысцей
прычапіцца
пачуццю,
якому
імя ў нас—
клас!

Для Маякоўскага ленінская праўда— «вялікая адзіная праўда». І вось, каб паэтычна выразіць яе, трэба было нанава пераафарміць свой верш, ператварыць яго ў непасрэднага выразіцеля сваёй вялікай чалавечай усхваляванасці. Застаючыся з вока на вока з камсамольскай, з рабочай аўдыторыяй, Маякоўскі хацеў дайсці да «сакрэтаў» такой паэзіі, якая-б менш за ўсё даходзіла да чытача «як паэзія», у сілу нейкіх адвечных («от Адама до наших дней») «паэтычных» якасцей, а як прамы зварот, як усхваляваная чалавечая размова. У «Леніне» былі закладзены асновы гэтага верша. У ім няма ні метафар, ні паэтычных гіпербал. У ім толькі голас здзіўляючай чыстаты і здзіўляючай шчырасці, голас паэта, улюбёнага ў сваю адваяваную зямлю. Лёгка пакрываючы шумок варожых галаскоў, гэты голас Маякоўскага і зараз нерастрачана гучыць над гулам маладзёжных аўдыторый, над краінай, над светам.

Замест агляду друку

Некалькі заўваг

У гістарычную восень 1939 года, у дні вызвалення нашых братоў-беларусаў, ачышчэння іх зямлі ад воўчых белапанскіх банд, нарадзіліся газеты заходніх абласцей рэспублікі. І гэтыя газеты нясуць у глыб працоўных мас агністае, натхняючае працоўных на барацьбу супроць ворагаў і на будаўніцтва вольнага шчаслівага жыцця слова бальшавіцкай праўды.

26 верасня жыхары г. Брэста чыталі першы нумар газеты «Рабочы», якая паведамляла аб стварэнні ў горадзе часовага ўпраўлення і змяшчала гістарычную прамову главы Савецкага ўрада таварыша В. М. Молатава па радыё 17 верасня. У гэтым-жа нумары — хвалюючы верш П. Броўкі «Заходнім беларусам».

Рэдакцыя газеты «Рабочы» улічыла сілу мастацкага слова, і ў далейшых нумарах газеты мы знаходзім вершы Я. Купалы, А. Твардоўскага, Джамбула, нарысы А. Ісбаха, В. Лугаўскога, Е. Далматоўскага. Добрым пачынаннем газеты з'явілася і азнаямленне свайго чытача з лепшымі савецкімі песнямі, як «Песня аб радзіме», «Бывайце здаровы», «Песня аб Кахоўцы», «Масква». Але трэба заўважыць, што рэдакцыя знаёміла свайго чытача толькі з тэкстам песень і гэтым толькі напалову выканала сваю задачу папулярызацыі гэтых песень.

Прагляд камплекта газеты «Рабочы» выклікае неабходнасць узняць некаторыя пытанні, якія, на нашу думку, тычацца практыкі работы і некаторых іншых газет заходніх абласцей БССР.

Газета «Рабочы» надзвычай мала ўдзяліла ўвагі жыццю і рабоце мастацкай інтэлігенцыі, літаратараў свайго горада і вобласці. На старонках газеты мы чыталі толькі некалькі маленькіх інфармацыйных заметак на гэту тэму.

Выяўляць пісьменніцкія кадры нашых заходніх абласцей, дапамагаць творчаму росту іх — прамы абавязак газеты. Увага газеты павінна быць накіравана і на дапамогу пачынаючым пісьменнікам— выяўленню талентаў з глыбінь народа. Газета змясціла адзін верш пачынаючага—вучня І. Шчуроўскага «Былое не вернется вновь». Гэта добра. Пажадана толькі, каб творы і прафесіянальных пісьменнікаў і маладых былі не выпадковымі гасцямі на старонках газеты.

Поруч з гэтым газеты заходніх абласцей павінны знаёміць свайго чытача з буйнейшымі савецкімі пісьменнікамі не шляхам выпадковага змяшчэння асобнага верша, а планамерным паказам іх творчасці і папулярным расказам аб самых пісьменніках. У гэтым-жа парадку трэба расказваць аб поспехах усіх галін нашага мастацтва і творчасці буйнейшых майстроў яго, аб росквіце сацыялістычнай культуры народаў вялікага Савецкага Саюза.

Агульнавядома, якое важнае значэнне мае збіранне і папулярызацыя народнай творчасці — мастацкіх твораў, народжаных талентам і мудрасцю народа. І ў адным з нумароў «Рабочага» мы сустракаем фальклор, але ён... перадрукаван з кніжкі «Дарэвалюцыйная і Савецкая Беларусь у народнай творчасці».

Большасць газет заходніх абласцей дагэтуль не распачалі неабходнай і ўдзячнай работы па збіранню мясцовага фальклору—выдатнейшых твораў народа, адлюстроўваючых думы і спадзяванні яго. Вольнае слова жыло ў народзе ў часы панскага іга. Гэтым словам народ клеймаваў з вялікай сілай нянавісці палачоў-катаў і выказваў сваю гатоўнасць да барацьбы. Натхнёным, ідучым ад самых глыбінь сэрца, словам услаўляе народ армію-вызваліцельніцу—Чырвоную Армію і выказвае глыбокую ўдзячнасць і любоў сваю да мудрага правадыра — вялікага Сталіна.

Гэту творчасць патрэбна клапатліва і любоўна сабраць. Яна з'явіцца каштоўнейшым здабыткам культуры нашага народа.

Прапагандысцкая-ж, выхаваўчая сіла мастацкага твора і ў асаблівасці народнага — невымерна вялікая. І газеты ў штодзённай размове са сваім чытачом павінны шырока выкарыстоўваць мастацкае слова, у асаблівасці мудрае слова народнай творчасці.

Асаблівае значэнне для газет заходніх абласцей маюць пытанні мовы. Трэба ўлічыць, што газеты з'яўляюцца для шырокіх мас насельніцтва заходніх абласцей амаль асноўнай крыніцай вывучэння мовы, авалодання граматай. І гэта ставіць перад рэдакцыямі газет надзвычай адказныя задачы —патрэбна зрабіць стыль газет простым і ясным, даступным разуменню шырокіх мас, змагацца за дасканаласць і граматнасць мовы. Нажаль, многія газеты заходніх абласцей не ўлічваюць выключнай важнасці гэтых пытанняў, — стыль і мова іх пакідаюць жадаць шмат лепшага.

Паспяховае вырашэнне ўсіх гэтых задач зробіць газеты заходніх абласцей яшчэ больш дзейснымі ў ганаровай справе палітычнага і культурнага выхавання шырокіх мас працоўных.



«Дружба». Эскіз скульптуры засл. дзеяча мастацтваў БССР А. Грубе.
Фота І. Каплінскага.

Ц. КРЫСЬКО

ДВА ВЕРШЫ

І. СЛОВА

На дарожным схіле паміж кветак,
Між травы закрасавала: «Сталін».
Гэта зерні сейбіта-паэта
Пад вясновым сонцам прараслі.

Гэта шчодрая, разумная прырода
Слову колер выбірала,
Каб цвіло яно не дні, а годы
І вялікага правадыра вітала.

Вечна жыць, расці пахучым травам,
Піць ласкавага святла праменні.
Шчасця большага няма, чым права
Зернем прарасці ў пакаленнях.

ІІ. НАРАДЖЭННЕ КРЫШТАЛА

Хай кроў напоіць
кожны мой радок.
Хай змочыць
горкі пот яго
расой—
І ў песенных лістах
заходзіць свежы сок.
А высахне раса—
заззяе ў слове
соль.

Крэпасць Асавец, 1939.

Н. ЗЕЛЯНОЎ

Герцэн і Талстой

(Да 70-годдзя з дня смерці А. І. Герцэна)

«Ушаноўваючы Герцэна, пралетарыят вучыцца на яго прыкладзе вялікаму значэнню рэвалюцыйнай тэорыі; — вучыцца разумець, што самаахвярная адданасць рэвалюцыі і зварот з рэвалюцыйнай пропаведдзю да народа не прападае нават тады, калі цэлыя дзесяцігоддзі аддзяляюць пасеў ад жніва; — вучыцца вызначэнню ролі розных класаў у рускай і міжнароднай рэвалюцыі».

В. І. ЛЕНІН.

А. І. Герцэн быў адным з любімых пісьменнікаў Л. Н. Талстога. Абодва пісьменнікі, будучы сучаснікамі, праяўлялі вялікую цікавасць адзін да другога. Калі Герцэн даведаўся ў 1857 годзе, што Талстой у гэты час вандруе па Заходняй Еўропе, ён выразіў жаданне пазнаёміцца з ім. У пісьме да Тургенева ад 18 лютага (2 сакавіка) 1857 года Герцэн пісаў, што будзе «вельмі, вельмі рад» пазнаёміцца з Талстым і прасіў Тургенева перадаць яму сваё прывітанне, як ад «шчырага паклонніка яго таленту». Хутка паміж Герцэнам і Талстым, к іх узаемнаму задавальненню, адбылося, у лютым таго-ж года, знаёмства. Будучы за граніцай, Талстой неаднаразова наведваў Герцэна і вёў з ім перапіску. Аб гэтым сведчыць Герцэн у пісьмах да Тургенева.

У дзённіках і пісьмах Талстога, а таксама ў дзённіку бліжэйшага яго прыяцеля — Д. П. Макавіцкага — «Яснополянские записки», у «Ежедневнике» С. А. Талстой мы натыкаемся на шматлікія запісы, якія сведчаць аб чытанні Талстым Герцэна. Талстой неаднаразова чытаў Герцэна ўголас сваім дамашнім, што сведчыць аб тым, наколькі Талстой любіў яго.

Мы маем шматлікія станоўчыя водгукі Талстога аб Герцэне. У дзённіку ад 4 лістапада 1856 года сваё ўражанне ад чытання «Полярной звезды», якая выдавалася Герцэнам, Талстой выражае словамі: «Вельмі добра». У запісу дзённіка ад 23 ліпеня 1860 года свае ўражанні ад чытання Герцэна Талстой выказвае такімі словамі: «Размягаўшыйся розум, хворае самалюбства, але шырыня, спрытнасць і дабрата, прыгажосць — рускія».

У пісьме да В. Г. Чарткова ад 9 лютага 1888 года Талстой піша: «Чытаю Герцэна і вельмі захапляюся і спачуваю таму, што яго творы забаронены». У гэтым-жа пісьме Талстой даў наступную характарыстыку Герцэну: «Гэта пісьменнік, як пісьменнік мастацкі, калі не вышэй, то ўжо напэўна роўны нашым першым пісьменнікам». У заключэнне гамжа Талстой дадае: «і добры, шчыры чалавек».

У пісьме да мастака Н. Н. Ге ад 13 лютага 1888 года ён пісаў: «Увесь апошні час мы чыталі і чыталі Герцэна... што за дзіўны пісьменнік! Наша жыццё рускае за апошнія дваццаць год было-б не тым, калі-б гэты пісьменнік не быў схаван ад маладога пакалення. З арганізма рускага грамадства вынут гвалтам вельмі важны орган».

У пісьме да В. Г. Чарткова ад 6 кастрычніка 1899 года Талстой паведамляе, што ён перачытвае «Пісьмы да старога таварыша» Герцэна і захапляецца імі.

У «Яснополянских записках» Д. Макавіцкага ад 26 ліпеня 1905 года запісана, што Талстой чытае «расчуленым голасам» першы раздзел апавядання Герцэна «Абавязак перш за ўсё». «Нічога падобнага няма ў рускай літаратуры», — прыводзіць ён тут-жа водгук Талстога аб гэтым апавяданні.

У дзённіку ад 12 кастрычніка 1905 года Талстой запісаў: «Чытаў Герцэна «З таго берага» і таксама захапляўся. Трэба было-б напісаць аб ім, каб людзі нашага часу разумелі яго. Наша інтэлігенцыя так апусцілася, што ўжо не можа зразумець яго. Ён ужо чакае сваіх чытачоў наперадзе. І далёка над галовамі цяперашняга натоўпу перадае свае мыслі тым, якія здолеюць зразумець іх».

Выключна высока ацаніў Талстой апавяданне Герцэна «Пашкоджаны». У «Яснополянских записках» Д. Макавіцкі ад 29 студзеня 1905 года паведамляе, што Талстой чытаў уголас апавяданне «Пашкоджаны» і захапляўся ім. «Герцэн—паэтычная натура і філасофская», — перадае аўтар запісак словы Талстога, сказаныя пад уражаннем прачытанага апавядання. У тых-жа «Яснополянских записках» Макавіцкі (запіс ад 23 кастрычніка таго-ж года) расказвае, што Талстой чытаў уголас «з хваляваннем» «Пашкоджанага» Герцэна і выказаў намер напісаць прадмову да гэтага апавядання. Прадмовы ён так і не напісаў, але вельмі знамянальна, што гэта апавяданне ён змясціў у свой «Круг чтений».

У кнігу «На каждый день» Талстой таксама ўключыў рад выказванняў Герцэна, поўнасцю салідарызіруючыся са зместам іх.

У мастацкіх творах Талстога мы таксама знойдзем рад стылевых асаблівасцей, якія радняць яго з Герцэнам і якія сведчаць аб тым, што Герцэн нейкімі бакамі свайго генія быў папярэднікам Льва Талстога.

У зарысоўцы Напалеона ў «Былым і думах» Герцэна і ў «Вайне і міры» Л. Талстога мы знойдзем шмат падабенства.

У вобразе Нікалая І ў «Былым і думах» і ў «Хаджы Мураце» Талстога мы таксама знойдзем рад агульных штрыхоў. І Герцэн і Талстой гавораць пра абмежаванасць розуму Нікалая, і той і другі адзначаюць самазакаханасць яго, дэспатызм і жорсткасць. Герцэн гаворыць аб «зімніх вачах» Нікалая. Талстой таксама адзначае яго «цмяныя» безжыццёвыя вочы.

Больш за ўсё кропак сутыкання выяўляецца паміж раннімі рамантычнымі творамі Герцэна і творамі пазнейшага перыяду Талстога. Такія творы Герцэна, як «Легенда», «Ліцыній», «Вільям Пэн», «Елена» некалькі прадвасхішчаюць творы Талстога пазнейшага перыяду. Агульнасць выяўляецца ў рэлігійнай афарбоўцы ранніх твораў Герцэна і позніх — Талстога, у выбары тэм і сюжэтаў з эпохі першых часоў хрысціянства, у выкарыстанні жыцція святых і легенд, у зацікаўленасці да сектанцкага руху, у імкненні спалучаць сацыяльныя праблемы з рэлігійнымі, ідэі сацыялістычныя з евангельскім вучэннем.

У драматычнай спробе Герцэна «Вільям Пэн» агульнасць матываў з талстоўскай творчасцю выяўляецца ў пастаноўцы сацыяльных праблем, якія тут вырашаюцца Герцэнам прыблізна ў талстоўска-рэлігійным духу. Агульнасць матываў выражана ў крытыцы афіцыйнай царквы і ў зацікаўленасці да сектанцкага руху. Агульнасць матываў выяўляецца і ў крытычных адносінах абодвух мастакоў да эксплаататарскіх класаў. Вобраз Вільяма Пэна нагадвае нам вобраз талстоўскіх каючыхся дваран, парываючых са сваім класам і ідучых у народ. Шавец Фокс у адносінах да Вільяма Пэна выконвае тут ролю Платона Каратаева. Але і па характару свайму ён блізкі талстоўскім вобразам з народа. Некаторымі рысамі Фокс нагадвае нам вобраз безыменнага бадзягі-пратэстанта з «Васкрасення» Талстога. Фокс таксама ненавідзіць багатых, клеймiць «служак Хрыста», называе іх фарысеямі, спачувае бедным і таксама выступае прапаведнікам хрысціянства.

Аповесць «Елена» можа быць названа прадвесцем «Васкрасення» Талстога — і па тэме, і па сюжэту, і па пастаўленых праблемах, і па рэалістычнаму аднолькаму адлюстраванню дваранскага свецкага грамадства. Герой гэтай аповесці князь Цільтоў нагадвае Нехлюдава. Ён таксама, падобна Нехлюдаву, кідае на волю лёсу скромную, чэсную, загубленую ім небагатую дзяўчыну Елену. Ён таксама вядзе разбэшчанае жыццё ў свецкім грамадстве, аддаючыся яго шкоднаму ўплыву. Падобна Нехлюдаву, пад уплывам гібелі Елены, ён у канцы аповесці маральна перараджаецца. Перараджэнне носіць рэлігійнае адценне — князь Цільтоў ідзе ў манастыр. Праўда, Нехлюдаў у Талстога ў манастыр не пайшоў, але спецыфіка духоўнага перараджэння ў абодвух мастакоў аналагічная.

У далейшай творчасці, у саракавыя годы, Герцэн перажывае эвалюцыю ў сваёй творчасці ад рамантызма да рэалізма. У гэтыя годы ён вызваляецца ад сваіх рэлігійных настрояў, ад якіх ён не быў поўнасцю вольны ў трыццатыя годы. Рэальная натура, па яго словах, у ім «узяла верх». Герцэн у саракавыя і наступныя годы выступае адным з яркіх прадстаўнікоў гогалеўскай натуральнай школы. Сваім раманам «Хто вінават» ён падрыхтаваў раман Чарнышэўскага «Што рабіць?». Як рэвалюцыйны дэмакрат, Герцэн з'яўляўся звязваючым звяном паміж двума пакаленнямі рэвалюцыянераў — пакаленнем дзекабрыстаў і пакаленнем разначынцаў, якое ўзначальваў Чарнышэўскі.

Талстому быў чужды Герцэн, які бачыў у Гегелю «алгебру рэвалюцыі», які захапляўся матэрыялістычнай філасофіяй Фейербаха і ішоў да Інтэрнацыянала, кіруемага Марксам. Але і ў рэвалюцыйна-дэмакратычных настроях Герцэна было нешта такое, што збліжала яго з Талстым, як з «люстрам рускай рэвалюцыі». Вышэй прыведзеныя водгукі Талстога аб Герцэне сведчаць аб гэтым.

Абодвух мастакоў радніў перш за ўсё пратэст супроць прыгонніцтва і тагачаснага палітычнага ладу. Іх радніць разрыў з дваранска-памешчыцкім класам і адыход у народ. Герцэнаўскі гуманізм у адносінах да народа быў блізкі Талстому. Герцэнаўская ідэя аб праве сялян на зямлю таксама была адной з самых любімых асноўных ідэй Талстога. Талстому была блізкай і герцэнаўская глыбокая вера ў рускі народ. У герцэнаўскім сацыялізме, названым Леніным «дабрадушнай фразай», ёсць таксама такое, што радніла Герцэна з Талстым. Апошняму былі блізкімі герцэнаўскае расчараванне ў Захадзе, народніцкая арыентацыя Герцэна на рускага мужыка і сялянскую абшчыну, адмоўныя адносіны Герцэна да капіталізма. Талстому таксама не былі чужымі некаторыя народніцкія ілюзіі, хоць, вядома, народнікам у поўным сэнсе гэтага слова ён ніколі не быў.

У нашу эпоху мы асвойваем спадчыну абодвух вялікіх мастакоў. Артыкулы В. І. Леніна аб Герцэне («Памяці Герцэна») і аб Талстым з'яўляюцца ўзорам таго, як трэба асвойваць гэту спадчыну, вывучаючы яе «з пункту гледжання характару рускай рэвалюцыі і рухаючых сіл яе». (Ленін, «Леў Талстой, як люстра рускай рэвалюцыі»).

Мы па праву ганарымся гэтымі двума вялікімі рускімі мастакамі і ў іх спадчыне мы бярэм перш за ўсё тое, што рабіла іх «люстрам рускай рэвалюцыі», што рабіла іх вялікімі народнымі мастакамі, змагарамі за лепшае жыццё для народа.

У КІНОСТУДЫІ „СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

* * *

За новыя поспехі беларускай кінематаграфіі

Ленін і Сталін з класічнай выразнасцю акрэслілі значэнне кіно, як самага масавага і дзейснага мастацтва. Савецкае кіно, дасягнуўшае, дзякуючы клопатам партыі і ўрада, бліскучага творчага росквіту, з'яўляецца гэтым па-сапраўднаму масавым, любімым мільёнамі працоўных мастацтвам, дзейсным і магутным сродкам комуністычнага выхавання працоўных.

У ліку выдатных твораў савецкай кінематаграфіі ёсць рад фільмаў беларускай кіностудыі «Совецкая Беларусь». Але пры наяўнасці асобных творчых удач, кіностудыя «Совецкая Беларусь» не здолела вырашыць асноўных задач развіцця беларускай кінематаграфіі. Кіностудыя была адарвана ад сваёй рэспублікі, ад творчых кадраў яе, ад мастацтва і літаратуры Совецкай Беларусі.

Партыя і ўрад стварылі для кіностудыі «Совецкая Беларусь» усе ўмовы для далейшай плённай творчай работы. Кіностудыя перавезена з Ленінграда ў Мінск. У Мінску разгорнута будаўніцтва магутнай па сваіх вытворчых магчымасцях і дасканалейшай па тэхнічнаму абсталяванню кіностудыі.

Перад беларускай кінематаграфіяй — выдатнейшыя перспектывы, шырокі шлях творчага развіцця.

Беларускі народ чакае ад сваіх майстроў кіно стварэння ў самы бліжэйшы час выдатнейшых фільмаў, узбагачаючых і прыўмнажаючых славу соцыялістычнай культуры нашай рэспублікі.

Стварыць фільм аб вялікім настаўніку і другу беларускага народа, ствараль ніку беларускай дзяржаўнасці — аб таварышу Сталіне, расказаць натхнёнай мовай кіномастацтва аб гістарычных днях вызвалення нашых братоў-беларусаў, аб з'яднанні нашага народа, паказаць пышны росквіт рэспублікі — асноўныя творчыя задачы беларускай кінематаграфіі.

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» павінна ўстанавіць шчыльныя творчыя сувязі з пісьменнікамі БССР. Пачатак гэтаму зроблен. Патрэбна штодзённа пашыраць прыцягненне да работы ў кіно як старэйшых майстроў мастацкага слова, так і маладых сіл нашай літаратуры, клапатліва выхоўваць кадры ўласных кінодраматургаў.

Кіностудыя павінна шырока выкарыстаць творчыя кадры нашага мастацтва— актораў, мастакоў, кампазітараў.

Плённая работа ў нашай кінематаграфіі творчых работнікаў літаратуры і мастацтва рэспублікі забяспечыць бліскучае вырашэнне задачы творчага ўздыму беларускага кіно.

Стварыць высокамастацкія фільмы

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» стварыла рад карцін, якія з'яўляюцца выдатнымі дасягненнямі ўсяго совецкага кіно. Фільмы «Шукальнікі шчасця», «Шлях карабля», «Балтыйцы» паказалі вялікае майстэрства рэжысёрскіх і аператарскіх сіл студыі. Але за ўвесь перыяд сваёй работы кіностудыя не здолела стварыць фільма аб Совецкай Беларусі.

Толькі пасля пастановы ўрада аб рабоце кіностудый і змены кіраўніцтва ў Камітэце па справах кінематаграфіі пры СНК СССР, студыя пачала працаваць з беларускімі пісьменнікамі.

Справа гонару беларускіх пісьменнікаў стварыць поўнацэнныя мастацкія творы і сцэнарыі, якія-б сведчылі аб высокай нацыянальнай культуры Совецкай Беларусі. І студыя абавязана запрасіць для работы над сцэнарыямі Янку Купалу, Якуба Коласа, М. Клімковіча, М. Лынькова, З. Бядулю, Р. Мурашку і іншых пісьменнікаў БССР.

Намі зусім не закранута пісьменніцкая моладзь, якая спрабуе сілы і на фронце кіно і якую мы недаацэньвалі да сёнешняга дня.

У будучых сцэнарыях і фільмах мы павінны паказаць узоры бязмежнага гераізма беларускага народа, яркай мовай кінокарцін расказаць аб рэволюцыйным руху ў Беларусі, аб гістарычнай ролі і барацьбе за шчасце беларускага народа нашых геніяльных правадыроў Леніна і Сталіна. Мовай кінообразаў мы павінны расказаць, як змагаўся беларускі народ з агентурай міжнароднага фашызма, як наш гераічны народ стварыў новае, радаснае соцыялістычнае жыццё.

Наша студыя, абапіраючыся на выхаваныя ёю кадры рэжысёраў — тт. Ю. В. Тарыча, В. В. Корша, А. Файнцымера, Э. Аршанскага, Шрэйбера, Анненскага, І. Шапіра, С. Ф. Наўроцкага, Ю. М. Стальмакова, С. І. Сплашнова, А. Шульмана, І. Шульмана, Е. Л. Гезіна, аператараў — тт. Рабава, Рагоўскага, Шлюглейта, Пагодзіна, Гарэліка, драматурга-сцэнарыста Н. Таўбэ і іншых, — павінна прыцягнуць да работы ўвесь акторскі актыў беларускіх тэатраў, творчых работнікаў усіх галін мастацтваў Совецкай Беларусі.

Наша студыя стварыла рад навуковых і вучэбных карцін, якія прадстаўляюць значны інтарэс не толькі для БССР, але і для працоўных усёй нашай краіны: «Асканія-Нова» (рэжысёр Пуш), «Асваенне балот у БССР», «Работа санчасці ў баю» (рэжысёр Стальмакоў), «Беларуская ССР» (рэжысёр Шульман) і інш. Зараз ёсць магчымасць стварыць рад карцін па заказу нашых наркаматаў, але апошнія да гэтага часу не праявілі належнай увагі да стварэння патрэбных для школ вучэбных фільмаў.

Камітэтам па справах кінематаграфіі ў першым квартале 1940 года па нашай студыі запланіравана работа над двума мастацкімі карцінамі — «Жніво» і «Як трэба любіць» і заканчэнне сцэнарыя «За Беларусь Совецкую», дзе паказана роля таварыша Сталіна ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці. Карціна «Мая любоў» рэжысёра Корша, якая знаходзіцца ў вытворчасці, будзе закончана ў канцы студзеня.

Закончаны варыянты на беларускай мове гукавога і нямога фільмаў «Вогненныя годы». Студыя выпускае на беларускай мове фільмы «Вялікі грамадзянін» і «Член урада». У Мінску студыяй засняты і зладжаны вучэбныя фільмы: «Група самаабароны жылога дома», «Здавай нормы ППХА», «Санітарны і проціхімічны пакеты».

Перамагаючы цяжкасці новага пачатнага этапа ў рабоце кіностудыі, мы створым новыя высокамастацкія фільмы, якія будуць дэманстрыраваць росквіт беларускага нацыянальнага мастацтва.

Е. В. ЮДЗІН,
дырэктар кіностудыі.

Ю. М. СТАЛЬМАКОЎ,
начальнік мастацка-вытворчага аддзела.

Заяўка—самакантроль кінодраматурга

Сцэнарны аддзел кіностудыі «Совецкая Беларусь» прыступіў да шырокага разгортвання работы па забеспячэнню ўдзелу беларускіх пісьменнікаў у стварэнні фільмаў беларускай кінематаграфіі. Здаецца, упершыню за пятнаццаць год існавання студыі гэта работа праводзіцца не ў якасці фармальнай адпіскі і чарговай кампаніі па размяшчэнню сцэнарных заказаў сярод беларускіх пісьменнікаў, так сказаць, для ачысткі сумлення. Пісьменнікі, якія былі ўжо ў сцэнарным аддзеле пасля яго пераезду ў Мінск (Чорны, Якімовіч, Рамановіч і г. д.), мне здаецца, пераканаліся ў тым, што кіраўніцтва кіностудыі імкнецца ў што-б там ні стала давесці замыслы пісьменнікаў да экрана, усяляк дапамагчы таварышам, як'я жадаюць працаваць у кінематаграфіі, у хутчэйшым аваладанні спецыфікай літаратурнага твора для кінематографа.

Першым звяном работы пісьменнікаў над сцэнарыем, першым, калі можна так сказаць, поваадам для гутарак аб будучым сцэнарыі з'яўляецца сюжэтная заяўка пісьменніка. Згодна ўстаноўленага ва ўсёй сістэме совецкай кінематаграфіі парадку, адносіны студыі з пісьменнікам пачынаюцца іменна з заяўкі. Што мы называем заяўкай? Заяўка не з'яўляецца, як многія схільны разумець, голай фармуліроўкай тэмы і пералікам аўтарскіх пажаданняў наконт ідэі, жанра і іншых асаблівасцей будучага сцэнарыя. Ад заяўкі мы патрабуем кароткага, яснага і пазбаўленага залішніх каментарыяў выкладання сюжэта на двух-пяці друкаваных старонках. Арыгінальнасць інтрыгі, трактоўка вобразаў, якая вынікае з сюжэтнай пабудовы, мысль аўтара, ідэя замыслу, якія становяцца яснымі ў выніку выкладання сюжэта,—вось, вядома, адзіны крытэрый, які можа правільна арыентыраваць аўтара і кіраўніцтва кіностудыі ў ацэнцы таго ці іншага замыслу будучага сцэнарыя. Такім крытэрыем з'яўляецца сюжэтная заяўка на сцэнарый.

Многія аўтары, як'я прыступаюць зараз да работы над сцэнарыямі, гавораць, што пісаць заяўку вельмі цяжка, што яны хутчэй згодны прадставіць лібрэта сцэнарыя ці проста напісаць сцэнарый. У гэтым перакананні ёсць пэўная доля ісціны, бо яшчэ вядомы прадстаўнік французскага рэалізма XIX стагоддзя Шанфлеры сцвярджаў: «Я не ведаю нічога больш цяжкага, чым яснасць». Між тым, добраякасная заяўка на сцэнарый ёсць нішто іншае, як яснае выкладанне аўтарскага замыслу.

Работа над заяўкай—самакантроль кінодраматурга. Па якасных адзнаках заяўкі, па яе дакладнасці аўтар правярае ступень сваёй падрыхтаванасці да напісання сцэнарыя. Вось чаму не варта пагарджаць гэтым адказнейшым этапам творчага працэсу. Недакладнасць замыслу, невыкрышталізаваная мысль, адсутнасць сталага погляду на рад адпраўных пунктаў будучага сцэнарыя могуць прывесці да творчай няўдачы, да лішняй траты творчых сіл.

Пісьменнікі т.т. Клімковіч і Якімовіч, якія прадставілі заяўкі на сцэнарыі ў кіностудыю «Совецкая Беларусь», на сваім вопыце маглі пераканацца, што паглыбленая работа над заяўкамі дапамагла ім правільна арыентыравацца ў асноўных пытаннях драматургічнай пабудовы будучага сцэнарыя, а праведзеная пры дапамозе сцэнарнага аддзела дапрацоўка гэтых заявак ужо зараз застрахавала іх ад многіх «сюрпрызаў», з як'мі звычайна сутыкаюцца многія нават вопытныя кінодраматургі, пагарджаючыя папярэдняй праверкай сваіх шуканняў у выглядзе дакладна выкладзенага сюжэта.

Вядома, не варта ператвараць зацверджаную заяўку ў гэткую, не падлягаючую перагляду, шпаргалку, па якой пішацца сцэнарый. У працэсе работы над сцэнарыем натуральна ўзнікненне новых мысляў, перагляд раду сюжэтных ліній, уводзенне новых матывіровак, сцэн і г. д.

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» зараз пры падтрыманні пісьменніцкай грамадскасці знаходзіць шляхі збліжэння з беларускімі пісьменнікамі для сумеснай плённай работы над фільмамі. Нажаль, у мінулым такія спробы не далі эфектных вынікаў. Зараз, калі некаторыя беларускія пісьменнікі паспяхова правялі работу сумесна з сцэнарным аддзелам студыі над першым этапам стварэння сцэнарыя—над складаннем добра апрацаваных, цікавых па тэме і сюжэтнаму замыслу заявак,— ёсць усе гарантыі таго, што студыя атрымае рад цікавых сцэнарыяў, што творы беларускіх пісьменнікаў у хуткім часе ўбачаць экраны Совецкага Саюза.

Н. ТАЎБЭ.

* * *

КІНОСТУДЫЯ ЧАКАЕ ДАПАМОГІ ПІСЬМЕННІКАЎ

Рашэннем партыі і ўрада кіностудыя «Совецкая Беларусь» перавезена з Ленінграда ў сталіцу ордэнаноснай БССР Мінск.

Гэта важнейшая падзея ў культурным жыцці БССР абавязвае ўсю грамадскасць, культурныя і навуковыя сілы рэспублікі да актыўнай дапамогі ў справе стварэння беларускай совецкай кінематаграфіі.

Гэта адносіцца ў першую чаргу да пісьменнікаў нашай рэспублікі, якія павінны ўключыцца ў работу па стварэнню высокаякасных мастацкіх твораў на актуальнейшыя тэмы соцыялістычнага будаўніцтва БССР.

Доўгі час у сувязі з тым, што кіностудыя «Совецкая Беларусь» была аддалёна ад цэнтра беларускай культуры, беларускія пісьменнікі не мелі магчымасці актыўна ўключыцца ў работу над стварэннем кіносцэнарыяў. Тэрытарыяльная адарванасць стварала нейкі бар'ер паміж пісьменнікамі і кіностудыяй. Акрамя таго, людзі, якія загадвалі сцэнарным аддзелам студыі, не праяўлялі адпаведнай увагі да пісьменнікаў БССР. Прыцягненне беларускіх пісьменнікаў у кіно часам замянялася фармальным заключэннем дагавора і выдачай авансу. Такая практыка «работы» з пісьменнікамі прыводзіла да таго, што пісьменнік, застаўшыся без усякай дапамогі з боку сцэнарнага аддзела, незнаёмы са спецыфікай кінематографа, папрацаваўшы доўгія месяцы над кіносцэнарыем і атрымаўшы адмоўную ацэнку сваёй работы, расчараваны пакідаў кіностудыю з думкай ніколі больш не вяртацца да яе.

Нездарма ў асяроддзі пісьменнікаў да апошняга часу існавала атмасфера недавер'я да кіностудыі, а з другога боку у сілу тых-жа абставін і пагардлівыя адносіны да самога віда драматургіі—кіносцэнарыя.

Нельга недаацаніць важнейшай ролі кінематографа, яго велізарных і неабмежаваных магчымасцей, як самага масавага, самага любімага народам віда мастацтва.

Кіносцэнарый — гэта асобная форма драматургіі, якая мае свае законы, сваю спецыфіку, але таленавітаму літаратару гэтага баяцца не трэба, а, наадварот, упарта вывучаючы тэорыю і практыку драматургіі кіно, ён пераканаецца ў тым, што гэта спецыфіка не такая ўжо складаная і недаступная, каб яе нельга было перамагчы.

Неспрактыкаванаму аўтару спачатку здаецца незразумелым цэлы рад кінематаграфічных прыёмаў. Напрыклад, некаторыя значэнні, накшталт «зтм» (зацямненне), «напл» (наплыў) і г. д., якія азначаюць усяго толькі канец ці пачатак эпізода і адносяцца галоўным чынам да рэжысёрскага сцэнарыя, прымаюцца няволытным аўтарам за спецыфіку кінематографа, у той час, калі гэтыя ўмоўныя азначэнні амаль не іграюць ніякай ролі ў літаратурным сцэнарыі.

Спецыфіка кінодраматургіі хаваецца значна глыбей і ставіць больш адказныя задачы перад аўтарам.

Для таго, каб па-сапраўднаму засвоіць спецыфічныя асаблівасці кіносцэнарыя, неабходна зразумець сутнасць кінематографа, галоўным чынам, як відовішчнага паказу драматычнай дзеі.

Гэта, вядома, даецца не адразу. Патрэбна, перш за ўсё, некаторая тэарэтычная і практычная падрыхтоўка аўтара, які жадае працаваць у кіно.

Сцэнарны аддзел кіностудыі «Совецкая Беларусь» лічыць сваёй першачарговай задачай работу з беларускімі совецкімі пісьменнікамі, прыцягненне і падрыхтоўку іх для работы ў кіно.

Ужо зараз праводзіць рад неадкладных мерапрыемстваў, якія павінны быць праведзены ў бліжэйшы час. Гэта сістэматычныя прагляды кінофільмаў, азнаямленне з лепшымі ўзорамі кінодраматургіі, арганізацыя семінара для аўтараў, якія жадаюць працаваць у кіно, сталая творчая кансультацыя і г. д.

Будзем спадзявацца, што беларускія совецкія пісьменнікі аднясуцца да пастаўленай перад імі задачы з усёй сур'ёзнасцю і прыйдуць на дапамогу беларускай кіностудыі.

Л. КАЦОВІЧ,
нач. сцэнарнага аддзела кіностудыі «Совецкая Беларусь».



Кадр з кінофільма «Мая любоў» вытворчасці студыі «Совецкая Беларусь». Сцэнарый І. Прута. Рэжысёр В. Корш.

„СНЕЖНАЯ КАРАЛЕВА"

Пастаноўка Тэатра юнага гледача БССР

Самае галоўнае і ў той-жа час самае цяжкое ў пастаноўцы п'ес-казак—гэта ўменне перадаць, з аднаго боку, усю прыгажосць казачнай фантастыкі і, з другога боку,—захаваць рэалістычную аснову твора. Усе цуды, якія адбываюцца ў казцы, не павінны быць самадаўлеючымі. Наперадзе павінна ісці мысль, якую падзеі казкі мусяць толькі адцяняць і падкрэсліваць.

«Снежная Каралева» напісана Е. Шварцам па матывах аднайменнай казкі Андэрсена. Сюжэт яе нескладаны: хлопчык Кай і дзяўчынка Герда слухаюць апавяданне Казачніка аб Снежнай Каралеве. І вось праўляецца сама Снежная Каралева, каб забраць да сябе ў замак і ўсынавіць хлопчыка Кая. Але Кай не хоча ісці з Каралевай, не хочуць адпусціць яго і бабка і Герда. Снежная Каралева цалуе Кая—і ён рэзка мяняецца, робіцца халодным і чэрствым. І хутка Кай знікае. Герда ідзе шукаць яго. Яна дасягае замка Снежнай Каралевы, адаходзіць заледзянелага Кая, сваімі слязамі і любоўю адагравае яго сэрца. Дружба, вернасць і гарачае сэрца перамагаюць усё,—такая ідэя п'есы.

Агульнае ўражанне ад спектакля «Снежная Каралева», пастаўленага маладым здольным рэжысёрам Р. Сусловічам,— добрае; але яно было-б мацнейшым, калі-б п'еса кампазіцыйна была больш моцна пабудавана. Асноўная лінія п'есы—імкненне Герды, не гледзячы ні на якія перашкоды знайсці і вярнуць Кая—губляецца ў радзе пабочных сцэн, якія самі па сабе і натрэнныя, але мала рухаюць дзею. Напрыклад, вельмі доўгія маналогі Казачніка.

Багацце пабочных сцэн, якія не звязаны з актыўнай дзейнасцю галоўных герояў, абядняе вобразы і Герды і Кая. Таму і ў п'есе і ў тэатры яны з'яўляюцца больш беднымі персанажамі, чым некаторыя эпізадычныя персанажы—Кароль, Атаманіха, Маленькая Разбойніца.

У пастаноўцы п'ес-казак асаблівую ролю адыгрывае мастацкае афармленне. Мастак М. А. Грыгор'еў у асноўным справіўся з гэтай задачай. Асабліва добра зроблен замак Снежнай Каралевы. Надрэнна зроблен лагер разбойнікаў. Бляднеей выглядае каралеўскі палац. У ім вельмі цёмна і няўтульна. Але ў цэлым спектакль аформлен добра.

У выкананні паасобных ролей назіраецца даволі стракаты малюнак.

Артыстка В. Брайчэўская (Герда) узяла не зусім правільны тон, хоць у цэлым даволі добра вядзе сваю ролю. Яна стварае вобраз вельмі бездапаможнай, няўпэўненай дзяўчынкі. На наш погляд, Герда павінна быць больш упэўненай і смелай, толькі тады вобраз яе будзе дастаткова выразным і поўным.

Даволі цікавы вобраз стварае артыстка Л. Клеўская, якая выконвае ролю хлопчыка Кая. Але хацелася-б, каб у сцэне пасля пацалункаў Снежнай Каралевы быў больш рэзкі пераход ад хлопчыка добрага да хлопчыка з ледзяным сэрцам, якому адразу сталі чужымі чалавечыя пачуцці. Сцэна ажыўлення Кая, па-нашаму, недастаткова выразна зроблена і яе трэба ўзмацніць эмацыянальна.

Добра выконвае сваю ролю артыст В. Окалаў, які здолеў стварыць запамінаючыйся вобраз камерцыі саветніка. Гэта чалавек, які ўсё сваё жыццё звязан з ільдом, які разбагацеў на продажы ільду, і які, урэшце, ператварыўся таксама ў лёд. В. Окалаў здолеў знайсці адпаведныя дэталі, ускрываючыя сутнасць гэтага ледзянога чалавека, у якога сэнс жыцця заключаецца ў грашах.

Снежную Каралеву іграе артыстка Ю. Гальперына. Яна здолела стварыць вобраз халоднай і ўладарнай жанчыны, якая сваім дотыканнем ператварае людзей у ледзяныя статуі.

Вельмі добра выконвае ролю Маленькай Разбойніцы артыстка С. Гурвіч. Яна правільна перадае псіхіку гэтай дзяўчынкі, выхаванай у асяроддзі разбойнікаў і прывыкшай, каб усе выконвалі яе капрызы.

З прыемнасцю глядзяцца сцэны з удзелам Ворана і Вароны. Артыст Н. Навіцкі (Воран) і артыстка Л. Кашына (Варона) выконваюць свае ролі з добрым пачуццём юмару, і ад іх ігры застаецца прыемнае ўражанне.

Артыст В. Ігнацьеў (прынц Клаус) і артыстка П. Басінкевіч (прынцэса Эльза) таксама няблага справіліся са сваімі ролямі.

Хочацца адзначыць добрую ігру артыста Л. Фрыдмана (Кароль) і артысткі С. Болітэр (Атаманіха). Не гледзячы на свае эпізадычныя ролі, яны здолелі знайсці для іх яркія фарбы.

Ролю Казачніка выконвае артыст В. Чэмелёў. На нашу думку, вобраз Казачніка трэба больш ажывіць, знайсці для яго характэрныя рысы. Прыкладна тое-ж самае можна сказаць і аб бабцы (артыстка М. Заборская). Ёй неабходна быць больш строгай і салідней.

Калектыву тэатра неабходна яшчэ папрацаваць над спектаклем па лініі агульнага яго скарачэння і большага акрэслення вобразаў. Тады «Снежная Каралева» будзе адным з любімых спектакляў нашага юнага гледача.

В. ЗУБ.

* * *

Наша першачарговая задача

Кіномастацтва — гэта мастацтва калектыўнае. Кінофільм ствараецца толькі калектыўнай творчасцю ўсіх удзельнікаў кінопастаноўкі. Наўрад ці варта ўдавацца ў складаныя спрэчкі аб тым, каму належыць вядучае месца ў стварэнні кінокарціны. Укажам толькі на тое, што ўдачу кінопастаноўкі, у першую чаргу, вызначае сцэнарый. Таму роля пісьменніка-драматурга набывае ў жыцці студыі рашаючае значэнне. І мы, работнікі беларускай студыі, чакаем ад беларускіх пісьменнікаў высокамастацкіх сцэнарыяў.

Гістарычнае з'яднанне ўсяго беларускага народа ў адной сям'і народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ставіць перад пісьменнікамі і кінаработнікамі БССР на 1940 год генеральную задачу стварэння вялікіх мастацкіх палотнаў, раскрываючых усю глыбіню і мудрасць рашэнняў партыі і ўрада, выражаных у гістарычнай прамове таварыша Молатава ад 17 верасня 1939 года.

Увесь размах і ўся глыбіня гістарычных рухаў павінны быць уключаны ў мастацкія магчымасці аднаго кінофільма. І як-бы ні захапілі мастака кіно складаныя і шматгранныя плыні гістарычнага жыцця, ён не можа выразіць іх без неабходнага мастацкага самаабмежавання. Кіномастацтва не церпіць шматтэмнасці, бессюжэтнасці, раскіданасці. Трэба абмежаваць сябе канкрэтнай фабулай і сюжэтам, а, значыць, і часам, месцам і колькасцю дзеючых асоб. Вось чаму асабліва цяжкая задача пабудовы сюжэта тады, калі існуе пастаўлены тэмай пэўны, дастаткова аб'ёмны рад праблем, фактаў і вывадаў, як гэта можа мець месца ў такім, скажам, фільме, які ўмоўна мы назавём «17-е верасня». Увесь неабходны матэрыял павінен быць ператворан у мастацкія вобразы, сюжэт павінен існаваць арганічна, а не фармальна. Ні на адну мінуту недапушчальна падмена мастацкага метада стварэннем сцэнак і рэплік, якія павінны ілюстрыраваць тое ці іншае палітычнае становішча,—шляхі схематызма і спрашчэнства недастойны совецкага мастацтва.

І тады фільмы беларускай студыі будуць па-сапраўднаму хваляваць сэрцы гледачоў і ўзбагачаць наша соцыялістычнае мастацтва.

Віктар ТУРЫН,
рэжысёр кіностудыі «Совецкая Беларусь».

Кінагарадок

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» пры пераездзе ў Мінск мела ў вытворчасці тры поўнаметражных мастацкіх карціны і дзве тэхнічных, маючых спецыяльнае прызначэнне ў справе ўмацавання і пашырэння абароннай работы сярод насельніцтва.

Такім чынам, творчы калектыў студыі ні на мінуту не спыніў сваёй асноўнай дзейнасці.

Зараз студыя мае ў сваім сцэнарным партфелі рад цікавых сцэнарыяў, якія поўнасцю забяспечваюць яе загрузку ў 1940 годзе.

Задача цяпер заключаецца ў тым, каб прадаставіць калектыву ў магчыма кароткі тэрмін усе ўмовы для ажыццяўлення намечанай праграмы. Для гэтага неабходна ўпарта і настойліва змагацца за ўвод студыі ў вытворчую эксплаатацыю, у шырокім сэнсе гэтага слова, ужо з сярэдзіны бягучага года.

Цікава адзначыць, што будуючаяся ў Мінску па Магілеўскаму шасе студыя з'яўляецца па сутнасці першай гукавой студыяй у Совецкім Саюзе. Буйнейшая студыя краіны—Ленінградская—праводзіць работу ў старых, непрыстасаваных памяшканнях — без дастатковага гукапаглынання, заглушэння і ізаляцыі; Маскоўская студыя працуе ў новых памяшканнях на Патылісе, але таксама запраектыраваных для здымак карцін нямога варыянту.

Паўтараем, толькі кіностудыя «Совецкая Беларусь», як па свайму праектнаму прызначэнню, так і па комплексу ўсіх дапаможных пабудоў, прадстаўляе сабою першую спробу абагульнення вопыту гукавой кіновытворчасці.

На плошчы памерам каля пяці гектараў размяшчаюцца: галоўны корпус з двума здымачнымі атэлье, з дасканалай гукаізаляцыяй, з належнай канструкцыяй, якая дапускае падачу верхняга святла мацнейшай асвятляльнай апаратуры. Атэлье маюць тысячу метраў здымачнай плошчы, у дапаможных памяшканнях запраектыраваны рэжысёрскія кабіны, пакоі актораў, грымёрныя, прагляднaя залы, буфеты, пакоі адпачынку і г. д. Будуецца і трохпавярховы будынак кінолабараторыі з усёй магутнай тэхнікай апаратуры для праяўлення і друкавання фільмаў.

У шарэнзе гэтых будынкаў высіцца ўжо дзеючы корпус падсобных цэхаў — механічнага, электратэхнічнага, дрэваапрацоўчага і інш.

Архітэктурная закончанасць будынкаў, дасканалая і строгая кампазіцыя галоўных фасадаў — усё гэта пераконвае нас у тым, што працоўныя рэспублікі будуць управе ганарыцца пабудовамі кінагарадка.

Агульны кошт будаўніцтва нашай студыі перавышае 10 млн. рублёў. Галоўныя і асноўныя работы прыпадаюць на гэты год. Мы ні на мінуту не сумняваемся ў тым, што пры тым велізарным падтрыманні і дапамозе, якія аказваюцца нам ЦК КП(б)Б і СНК БССР, калектыў будаўнікоў і калектыў творчых работнікаў студыі з гонарам справяцца з ускладзенымі на іх задачамі.

С. ХАХЛОЎ.
Галоўны інжынер будаўніцтва і нам. дырэктара студыі.

Фільмы, сцэнарыі, заяўкі...

Кіностудыя «Совецкая Беларусь» заканчвае ў бліжэйшы час здыманне камедыі «Мая любоў» І. Прута. Рэжысёр фільма засл. дзеяч мастацтваў БССР В. Корш.

На правах сумеснай пастаноўкі з студыямі «Мосфільм» і «Ленфільм» заканчваюцца карціны «Будні» і «Прыяцелі». Першы фільм (сцэнарысты Голікаў і Глазычоў, рэжысёр Шрэйбер) прысвечан дзейнасці нашага грамадзянскага паветранага флота ў мірнай абстаноўцы. Другі фільм, сцэнарый якога належыць Нікалаю Таўбэ, прысвечан дружбе моладзі, праблеме пачатку жыцця, паўналецця.

У рэжысёрскай распрацоўцы знаходзяцца два сцэнарыі: «Жніво» (аўтар Канст. Васіленка, рэжысёр Наўроцкі) і «Як трэба любіць» (аўтар М. Бац, рэжысёр Эдуард Аршанскі).

«Жніво»—сцэнарый, напісаны на беларускім матэрыяле. Тэма яго—тыл у часе вайны—раскрываецца на паказе жыцця аднаго калгаса ў пачатку вайны.

Сцэнарый «Як трэба любіць» прысвечан калгаснаму будаўніцтву ў Біраб іджане.

А. Зіновін і І. Шапазалаў заканчваюць сцэнарый «За Беларусь Совецкую», у якім будзе паказана роля таварыша Сталіна ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

У 1939 годзе праходзіла вялікая гаспадарча-палітычная кампанія — сцягванне хутароў у калгасныя цэнтры. Гэтай падзеі пісьменнік М. Клімковіч прысвяціў сваю заяўку на сцэнарый пад назвай «Апошні вечар на хутары».

Пісьменнік Янка Маўр прадставіў заяўку кіносцэнарыя, тэмай якога з'яўляецца культурны рост совецкай жанчыны.

Гістарычнай тэме—з'яднанню беларускага народа ў адзінай братняй сям'і—прысвяціў заяўку драматург Е. Рамановіч.

Драматург В. Вольскі даў заяўку на экранізацыю сваёй п'есы-казкі «Цудоўная дудка». Пісьменнік А. Якімовіч распрацаваў заяўку паводле матываў беларускіх народных казак. Усе заяўкі беларускіх пісьменнікаў зацверджаны Камітэтам па справах кінематаграфіі пры СНК СССР.

Кіностудыяй прыняты і яшчэ два сцэнарыі—«Дружба» Ільі Бражніка і М. Алейнікава і «Давер'е» Новікава-Прыбоя і Перагудава.

С. Сідзелеў і А. Шульман пішуць сцэнарый эксцэнтрычнай камедыі «Карнавал» на фізкультурную тэму.

Іл. Барашка заканчвае сцэнарый «На беразе ракі шырокай»—на калгасным матэрыяле.

Сцэнарый кінокамедыі пад назвай «Пена» прадставіў тав. Чачаноўскі. У сцэнарыі паказваецца, як часамі пустазвоны бяздзельнікі перашкаджаюць працаваць чэсным людзям.

Драматург Л. Кацовіч заканчвае сцэнарый кінокамедыі пад назвай «Сервіс» аб бытавым абслугоўванні насельніцтва.

П. ІЗОХ.

КОНКУРС НА КІНОКАМЕДЫЮ

Совецкі глядач прад'яўляе зусім справядлівыя патрабаванні на вясёлую, жыццёрадасную камедыю. І ў мэтах стварэння высокамастацкіх камедыйных фільмаў на тэмы сучаснай совецкай рэчаіснасці, а таксама для прыцягнення ў кінематаграфію новых кадраў драматургаў Камітэт па справах кінематаграфіі пры СНК СССР абвясціў конкурс на камедыйны кіносцэнарый.

Сцэнарыі, прад'яўляемыя на конкурс, могуць быць напісаны ў любым камедыйным жанры (бытавая камедыя, камедыя-сатыра, камедыя-гратэск, музыкальная камедыя, эксцэнтрычная камедыя і г. д.), але абавязкова на тэму сучаснай совецкай рэчаіснасці (соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і вёсцы, пытанні сям'і і быту, совецкі спорт, антырэлігійныя тэмы і інш.).

Сцэнарыі, прадстаўляемыя на конкурс, павінны мець арыгінальны сюжэт.

Камітэт па справах кінематаграфіі пры СНК СССР устанавіў наступныя прэміі за сцэнарыі: 1-я—25.000 руб., 2-я—20.000 руб., дзве 3-х па 15.000 руб., тры 4-х па 10.000 руб.

С. Ш.

Майстэрства навелы

Да 80-годдзя з дня нараджэння А. П. Чэхава

*

Л. БАРАГ

*

Майстэрства Чэхава выпрацоўвалася на старонках дробных юмарыстычных журналаў пачатку 80-х год. Чэхаў—супрацоўнік рэптыльнай юмарыстычнай прэсы—быў вельмі загружан пісаннем. Яму прыходзілася пісаць апавяданні, юмарыстычныя сцэнкі, фельетоны, анекдоты, надпісы да карыкатур, судовы рэпартаж, тэатральныя рэцэнзіі і нават раманы. На каляды ён павінен быў пастаўляць святочныя апавяданні, да «вясельнага сезона» і масленіцы—апавяданні аб вяселлях і купячых куппах, а к лету—апавяданні аб дачных мужах. Юмарыстычныя журналы былі разлічаны на абывацеля, які чытае на хаду: у карчме, у конпы, на вакзале, у поездзе, і патрабавалі апавядання «карапей вераб'інага носа». Як мы даведваемся з пісьмаў Чэхава пачатку 80-х год, яму нярэдка прыходзілася падпарадкавацца маленькай форме юмарэскі за кошт яе зместу.

Разам з тым пад уплывам гэтых умоў у Чэхаве выпрацаваўся выдатны майстар кароткай, адточанай навелістычнай формы, аб чым добра сведчаць такія чэхаўскія шэдэўры гэтага часу як «Хамелеон», «Дачка Альбіёна», «Маска», «Унтэр Прышыбееў». Гэтыя і многія іншыя раннія апавяданні Чэхава можна ахарактарызаваць словамі яго ўласных пісьмаў 80-х год: «Карапей зрабіць ніяк не мог», «А можна было-б і цалую аповесць напісаць на гэтую тэму», «Вось, як на ваенным караблі: там няма нічога лішняга—так і трэба рабіць у апавяданні».

Большасць першых апавяданняў Чэхава прадстаўляюць кароткія сцэнкі з двума-трыма персанажамі. «Пэнтрам цяжару павінны быць абодва»,—адзначаў Чэхаў у адным з сваіх пісьмаў пачатку 80-х год. Спісла, літаральна ў некалькіх словах абрысаваўшы герояў і абстаноўку, Чэхаў адразу ўводзіць чытача ў дзеянне, якое разгортваецца звычайна ў дыялагічнай форме. Характары персанажаў бяруцца ў гэтых апавяданнях у якой-небудзь адной вядучай рысе, напрыклад: грубы цынізм поўнаўладнага купца Пяцігорава ў апавяданні «Маска», ці баязлівасць і ліслівасць чыноўніка ў апавяданні «Смерць чыноўніка». Нярэдка апавяданне састаіць з завязкі і развязкі і нават з адной толькі завязкі—сярэдзіна і канец апавядання як-бы адсякаюцца (напрыклад, у «Зламысніку»).

Ужо ў такіх маленькіх юмарыстычных апавяданнях Чэхаў з гранічнай яснасцю умеў паказаць у смешным гнятучую пошласць і мерзасць, народжаныя палітычна-грамадскімі абставінамі рускага жыцця 80-х год. Так, з поваду аднаго з ранніх чэхаўскіх апавяданняў «Дачка Альбіёна» Горкі адзначыў: «шаноўная публіка, чытаючы «Дачку Альбіёна», смяецца і наўрад ці бачыць у гэтым апавяданні агіднейшых здзекаў сытага пана над чалавекам адзінокім, усяму і ўсім чужым».

Глыбокі трагізм, якім вее ад лепшых апавяданняў Чэхава першага перыяду, не ўкладваўся ў рамкі традыцыйнай юмарыстыкі. Вось чаму, пачынаючы з сярэдзіны 80-х год, калі Чэхаў, сур'ёзна задумваецца над «хмурым жыццём» наступіўшай эпохі рэакцыі, ён адчувае нездаволенасць сваёй падзённай работай у лёгкавесных юмарыстычных журнальчыках. Ён усё больш і больш пазбягае анекдатычных сюжэтаў, ствараючы апавяданні, насычаныя псіхалагічным зместам, і, урэшце, спыняе супрацоўнічанне ў юмарыстычнай прэсе. Пераход да псіхалагічных навел даваўся Чэхаву не адразу Так, напрыклад, у 1885 годзе амаль аднačасова з псіхалагічнай навелай «Гора» Чэхаў стварае «Конскае прозвішча». «Прывычаіўшыся да маленькіх апавяданняў, якія састаяць толькі з пачатку і канца,—адзначаў Чэхаў у адным з сваіх пісьмаў гэтага часу,—я сумую і пачынаю паддаваць, калі адчуваю, што пішу сярэдзіну». Паступова ў Чэхава выпрацоўваецца зусім іншая пісьменніцкая манера: калі раней ён пісаў штодзённа па апавяданню, а часам і больш, дык у спелы перыяд сваёй творчасці ён заяўляе: «сказаць, калі я скончу і пашлю апавяданне ці аповесць, для мяне таксама нялёгка, як прадрачы зацямненне сонца».

Нярэдка навелы Чэхава другой паловы 80-х год састаяць з адной «сярэдзіны». У змест іх зводзіцца да раскрыцця перажыванняў героя, звязаных з якім-небудзь захварэннем ці душэўным патрасеннем. Тавога роду «медыцынскімі манаграфіямі» (выраз Чэхава), напісанымі ў зусім новым для рускай літаратуры выглядзе з'яўляюцца, напрыклад, апавяданні «Урачы», «У аптэцы», «Тыф». У апавяданні «Тыф», паказаўшы з выключнай тонкасцю гісторыю хваробы і выздараўлення паручыка Клімава, Чэхаў канчае павестваванне наступным чынам: «Толькі пасля тыдня, калі ён у халацішку, падтрымліваемы Паўлам, падышоў да акна, зірнуў на хмарнае вясенняе неба і прыслухаўся да непрыемнага стуку старых рэльсаў, якія правозілі міма, сэрца яго сціснулася ад болю, ён заплакаў і прыціснуўся ілбом да аконнай рамы.—Які я няшчасны!—замармытаў ён,—які я няшчасны! І радасць саступіла сваё месца звычайнаму суму і пачуццю беззваротнай страты». Так тэма эпідэмічнага захворвання тыфам перарастае ў Чэхава ў шырокую грамадскую тэму інертнай і раўнадушнай інтэлігенцыі 80-х год. У апавяданнях другой паловы 80-х год Чэхаў востра ставіў грамадскія праблемы, але не даваў ім вырашэння, мяркуючы, што «мастак павінен быць не суддзёй сваіх персанажаў і таго, аб чым гавораць яны, а толькі староннім сведкай» Гэтым часткова тлумачыцца вонкавая статычнасць і незакончанасць многіх апавяданняў Чэхава таго часу і адсутнасць у іх яркіх развязак. Поўнай адсутнасцю якой-небудзь інтрыгі, вонкавай статычнасцю адрозніваюцца, напрыклад, апавяданні «Пошта», «Прыгажуні», «Непрыемнасць», «Дактар». Лірычная афарбоўка, выключнае ўменне пісьменніка браць характары ў іх цякучасці і раскрываць іх у кожны дадзены момант—вось што характэрна для гэтых рэчаў Чэхава. Падзеі паказваюцца ў такіх апавяданнях у непарыўнай сувязі з унутраным становішчам персанажаў Асаблівa характэрна ў гэтых адносінах апавяданне 1888 года «Прыпадак», у якім паказан «душэўны боль» чалавека «незвычайнага, сумленнага і глыбока чулага».

Калі ліберальны журнал 80-х год «Педеля» адзначыў адсутнасць у апавяданнях Чэхава вырашэння грамадскіх праблем, аб'явіў яго апалітычным пісьменнікам, Чэхаў назваў такую крытыку «мудрасць індзюкоў». Бясспрэчна, што Чэхаў у гэты час не меў чоткіх палітычных поглядаў і не заўсёды мог адказаць на мучыўшыя яго пытанні. Аднак, у тым, як Чэхаў ставіў пытанні і падходзіў да вырашэння ў сваіх творах, сказваецца пісьменнік вялікага грамадскага тэмпераменту. Яго героры будзілі розум і пачуцці чытача, патрабавалі ад яго дамысліванне твора, патрабавалі ад яго настойлівага адказу на пастаўленыя пісьменнікам пытанні. Такая актывізацыя чытача была вялікай перамогай чэхаўскага рэалізма.

Паватарства Чэхава, перамагаючы ім старых тургенеўскіх традыцый рускай прозы сказваецца вельмі акрэслена ў яго апісаннях прыроды, у якіх, па словах самога Чэхава, «трэба хапацца за дробныя прыватнасці, групіруючы іх такім чынам, каб пасля прачытання, калі зажмурыш вочы, давалася карціна». Так зроблена, напрыклад, карціна вячэрняй зары ў апавяданні 1886 года «Агаф'я»: «Засталася адна толькі барвовая палоска, ды і тая стала закрывацца дробнымі воблачкамі, як вугалі попелам». Такія вобразы, у адрозненне ад тургенеўскіх, былі разлічаны не на пасіўнае ўспрыняцце, а на актыўнае выабражэнне чытача. Сказанае адносіцца і да чэхаўскіх апісанняў душэўнага становішча героя. «У сферы псіхікі, — пісаў Чэхаў брату ў 1886 годзе, — таксама прыватнасці — хавай божа ад агульных мясцін». Так, напрыклад, паказваючы псіхічнае становішча героя апавядання «Тыф» — паручыка Клімава, які адчуў нядужасць, Чэхаў гаворыць: «Рукі і ногі яго неяк не ўкладваліся на канапе, хоць уся канапа была да яго паслуг...» Вельмі часта ўнутраны свет героя раскрываецца Чэхавым пры дапамозе нечаканага параўнання, падкрэсліваючага якую-небудзь дэталь. У апавяданні «Прыпадак» карціна першага снегу натуральна завяршаецца словамі, якія адносяцца да героя: «І ў душы разам з свежым, лёгкім марозным паветрам прачнулася пачуццё, падобнае на белы малады пушысты снег».

Глыбокім непаразуменнем з'яўляецца распаўсюджаны погляд на Чэхава, як на імпрэсіяніста, погляд, які грунтуецца на прыведзеным вышэй выказванні Чэхава аб ролі дробных прыватнасцей у стварэнні вобраза. У сапраўднасці «карціны» рэалістычны пейзаж Чэхава супрацьстаіць расплыўчатаму, зданнёваму імпрэсіяністычнаму пейзажу. Глыбока суб'ектыўная творчасць імпрэсіяністаў жывілася выпадковымі ўражаннямі. Чэхаўская-ж манера «хапацца за дробныя прыватнасці» з'яўляецца сродкам стварэння тыповых вобразаў і не мае нічога агульнага з «фразарчанай свядомасцю» пісьменнікаў-імпрэсіяністаў.

Да 90-х і 900-х год, калі Чэхаў станавіцца на шлях актыўнай і рашучай барацьбы з усерасійскім застоем, адносіцца стварэнне найбольш дасканалых яго апавяданняў. «У рускай літаратуры яшчэ не было навеліста, падобнага вам, а цяпер, вы ў нас самая каштоўная і буйная фігура»—пісаў у 1898 годзе Горкі Чэхаву. Калі ў Талстога аднойчы спыталіся аб аўтары «Чалавека ў футляры», ён назваў яго майстэрства «майстэрствам вышэйшага парадку».

У маленькім апавяданні «Чалавек у футляры» (1898) Чэхаў даў вычарпальную карціну гнятучай рэакцыі і абывацельшчыны 80—90-х год. Нечаканым спалучэннем некалькіх бытавых эпізодаў у апавяданні «Па справах службы» (1899) — апавяданні аб тым, як урач і следчы прыехаўшы ў вёску ўскрываць труп, застаюцца ў памешчыцкім доме. — Чэхаў з незвычайнай яркасцю асвятліў бездонне якое ляжыць паміж сялянствам і прыгожалушнымі лібераламі Дастаткова Чэхаву сціспла абрысаваць Іоныча, героя аднайменнага апавядання (1898), у розныя перыяды яго жыцця раз'язджаючага па гораду ва ўласным экіпажы, каб чытач ясна ўявіў увесь працэс паступовага апускання чалавека, поўнага сіл, у жудаснае абывацельскае балота, працэс, які мог паслужыць зместам шматтомнага рамана.

Усё сваё жыццё Чэхаў змагаўся з пошласцю і руцінай. Адштурхоўванне ад усякага шаблоннага, пошлага ў вобразах, кампазіцыі і мове твора — такая асноўная асаблівасць работы Чэхава — майстра. Нездарма Чэхаў у адным з сваіх пісьмаў раіў брату, таксама літаратару, пазбягаць апісанняў адстаўных салдатаў з чырвонымі насамі, выпіваючых рэпарцёраў сумленных маладых людзей без адзінай плямы і г. д. «Усё гэта было ўжо апісана і павінна быць аб'ядзжаема, як яма», гаварыў Чэхаў і сам заўсёды следаваў гэтаму правілу.

Выдатна ўменне Чэхава бясстрасным халодным апавядальным тонам узмацняць уражанне ад хвалюючых эпізодаў твора ў гэтых адносінах выключным шэдэўрам з'яўляецца чэхаўскае апавяданне «Бабы» (1891). Сам Чэхаў высока цаніў гэта майстэрства і ў пісьме да пачынаючай пісьменніцы Авілавай ад 1892 года ўказваў: «Чым адчувальней становішча, тым халадней трэба пісаць і тым адчувальней выйдзе: не трэба абсалюджваць».

Цэлы рад чэхаўскіх апавяданняў 90—900-х год канчаецца гутаркай ці разважаннямі герояў, раскрываючымі асноўную ідэю твора (напрыклад, «У ссылцы» «Чалавек у футляры», «Агрэст»). Цікава пры гэтым, што гэтыя рэплікі ці разважанні герояў ніколі не з'яўляюцца простым каментарыем, а іграюць ролю рэфлектара рэзкім і моцным святлом асвятляючага ўвесь твор. Чэхаў ніколі нічога не навязваў і не растлумачваў чытачу, але будзіў яго мыслі і пачуцці.

У адным са сваіх артыкулаў Горкі пісаў: «Як стыліст, Чэхаў недасягальны, і будучы гісторык літаратуры скажа, што мову гэту стварылі Пушкін, Тургенеў і Чэхаў. Выключная прыгожасць і музыкальнасць мовы пры максімальным лаканізме выразаў, уменне стварыць уражанне мовы таго ці іншага сацыяльнага асяроддзя, не прыбягаючы да хадзячых штампаў і спецыфічных слоўцаў. — такія выдатныя якасці чэхаўскага стылю.

Уплыў Чэхава — навеліста на рускую і сусветную літаратуру велізарны. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя адзін з нямецкіх крытыкаў, адзначаючы вялікі выключны поспех і ўплыў Чэхава ў Германіі, усклікнуў: «Чэхаў Чэхаў, без канца Чэхаў!». Аб сваёй вучобе ў Чэхава расказваюць многія пісьменнікі Захаду (Леелі Холцорд, Фрэнсіс Ньюмен, Бернард Келерман, Г. Банг і інш.). З амерыканскіх пісьменнікаў значны ўплыў Чэхава адчулі Дос-Пасос і Хэмінгуэй. З рускіх пісьменнікаў XX стагоддзя цяжка ўказаць хаця-б аднаго выдатнага навеліста, які-б не адчуў уздзейнічання чэхаўскага рэалізма. Па шляху, пракладзенаму Чэхавым, пайшоў далей класік сацыялістычнага рэалізма А. М. Горкі, падобна Чэхаву ненавідзеўшы пошласць і мяшчанства ва ўсіх іх праявах і падобна Чэхаву страсна любіўшы чалавека і яго працу.

На выстаўцы работ мастакоў Беластока

У Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР адкрыта выстаўка работ мастакоў-графікаў Беластока.

Перш за ўсё хочацца адзначыць работы Ю. А. Краеўскага. Гэта тонкі і сацыяльна-вострый мастак. Яго работы,



«Партрэт старой», афорт.
Мастак І. Е. Кшэчаноўскі.

галоўным чынам, прысвечаны сялянскаму жыццю ў былой Польшчы. Сацыяльны прыгнёт, надзвычайная беднасць, сваволле памешчыкаў і абуджаючыся да барацьбы беларускі народ—такія тэмы работ Ю. А. Краеўскага.

Асабліва выразныя рысункі «Песня» і «Сяляне б'юць прыказчыка». У першым мы бачым ідучых з поля беларускіх сялянак, якія спяваюць песню. У гэтым рысунку мастак Краеўскі вельмі ўдала перадаў нарастаючае ў сэрцах сялян абурэнне і гнеў супроць паноў. У другім рысунку паказаны паўстаўшыя сяляне, якія віламі б'юць панскага прыказчыка.

Мастак І. Е. Кшэчаноўскі прадстаўлен хоць і нязначнай колькасцю работ, але работы гэтыя сведчаць аб значным майстэрстве мастака. Адзначым літаграфію «Жанчына ў сутарэннях» афорт «Партрэт старой» і афорт «У прытулку для старых».

Цікавыя работы мастака Х. З. Тыбер. Асабліва вылучаюцца сацыяльныя партрэты: «Партрэт яўрэя», «Галава рабочага» і афорты на жанравую тэму—«Шавец» і «Разносчык вады». Работы гэтыя сведчаць аб вострай наглядасці мастака, аб яго ўменні адабраць галоўнае і перадаць яго на рысунку.

Вылучаецца на выстаўцы літаграф'я мастака Е. М. Малявіч «Беспрытульныя ў Польшчы». Заслугоўваюць быць адзначанымі работы Н. Г. Ляндау: афорт «Мангольская дзяўчына», гравюра на дрэве «Архітэктура Прымор'я».

Большасць прадстаўленых на выстаўцы работ прасякнуты духам дэмакратызма. Жывучы і працуючы ў цяжкіх умовах сацыяльнага прыгнёту і сваволля былой Польшчы, беларускія мастакі знаходзілі ў сабе грамадзянскую мужнасць тварыць для народа, для беларускіх рабочых і сялян, якія потым, пры дапамозе доблеснай Чырвонай Арміі, звергнулі ненавіснае панскае іга.

А. ДАЛІН.

М. КЛІМКОВІЧ

13 СТУДЗЕНЯ 1940 ГОДА

Там, дзе спрадвеку шалёны і п'яны
Сватаўся віхар к начы і пургэ;
Там, дзе бяздонная глыб акіяна
Чорнае неба зубамі грызе;
Там, адкуль сведка мінуўшчыны сівай,—
Кіт,—сапучы, адпаляецца проч,
Там, дзе часамі гарыць палахліва
Ззяннем халодным палярная ноч,—
Сёння героі бязмежнай адвагі,
Сёння тытаны савецкай зямлі,
Явай, што выйшла з няведамай сагі,
Поруч паставілі два караблі.

Сталін... Сядоў... І ў простым агнenні
Простыя людзі ў бязмежных марах.
Глыбы скрыгочуць і тонуць ў пене,
А над усім — палымнеючы сцяг!
А над усім—прывітанняў без ліку!
Цібы пульсацыю сэрца зямлі,
Ловяць падзяку краіны вялікай
Сеткай намёрзшых антэн караблі.
Не, не стрымаюць ніякія далі, —
Ні перашкоды стыхіі і людзей
Тых, каго партыя, воля і Сталін
Да перамогі вядзе.







Прэміраваныя праекты помніка-абеліска на магіле дукорскіх партызанаў. Злева направа: два праекты скульптара Жорава і архітэктара Марыкса, атрымаўшыя І і ІІ-ю прэмію; праект скульптара Глебава і архітэктара Марыкса, атрымаўшы ІІІ прэмію.
Фота І. Капланскага.

На джазаўскія тэмы

(КАНЦЭРТЫ УЦЁСАВА І СКАМАРОЎСКАГА У МІНСКУ).

Канцэрты Уцёсава выклікалі ў некаторай часткі слухачоў замяшанне і розныя тлумачэнні. Смелая тэатральнасць, манера дырыжыравання, непасрэдная весялосць і жыццёрадаснасць многіх здзівіла. Адна дзяўчына так і заявіла:

—Уцёсаў вельмі неглыбокі і зусім несур'ёзны. Я зусім не апладыравала Уцёсаву.

Апошнія словы былі сказаны не без гордасці і з такім, прыкладна, падтэкстам: глядзіце і зайздросце, якая я разумная, культурная і сур'ёзная.

Што сказаць дзяўчыне?

Студэнт кансерваторыі, культурны музыкант, шчыра прызнаўся:

—Уцёсаў зрабіў на мяне двайстае ўражанне; нібы і надрэнна, а між тым, мне здаецца, што гэта нават халтура.

—Чаму халтура?

—Не глыбока, не сур'ёзна, лёгкадумна вельмі...

Зноў гэта глыбіня і сур'ёзнасць! Жанры маюць свае цвёрдыя законы. Калі сімфонію Бетховена выконваць так, як Уцёсаў выконвае свае рэчы,—атрымаецца халтура. І, наадварот, калі-б Уцёсаў рэчы свайго жанру выканаў з музыкальнасцю і глыбінёй, якіх патрабуе выкананне сімфоніі Бетховена,—атрымалася-б таксама халтура.

Я запытаўся ў музыканта:

—Ці не знаходзіце вы, што джаз Уцёсава выконвае свае рэчы вельмі музыкальна — у сваім, вядома, жанры? Што аркестр гучыць сыграна, захапляюча лёгка, чыста і незвычайна рытмічна? І самае галоўнае — весела і жыццёрадасна?

Музыкант згадзіўся.

У выступленнях Уцёсава ўсё цвёрда ўстаноўлена. Мізансцэны, жарты, астроты. Нічога выпадковага, непрадуманага. Шкада толькі, што ў сваіх выступленнях Уцёсаў абмежаваўся амаль адным старым рэпертуарам, вельмі мала было ў яго песень савецкіх кампазітараў.

***

Пасля канцэрта джаза Скамароўскага ў памяці застаецца сам А. Скамароўскі, выдатны трубач-саліст («Яўрэйская мелодыя», «Блюз»), які віртуозна валодае сваім інструментам, і абаяльная К. Шульжэнка Спявачка сур'ёзна працуе над выконваемымі песенькамі. І гэта вельмі прыкметна. Цікавая трактоўка песень, прадуманы інтанацыі, талкова расстаўлены акцёрскія задачы. Цудоўны «Дзяўчына, бывай!», «Гадзіннік». У «Запісцы» хацелася-б менш сапраўднай сур'ёзнасці і больш добрай іроніі, ну, хоць-бы такой якой так многа ў «Гадзінніку» ці «Дзяўчыне» Дарэмна толькі Шульжэнка выконвае «Андрушу», а, магчыма, і «Чаліта»—гэта рэчы, нам так здаецца, не яе плана і мала цікавыя, асабліва «Андруша».

Што сказаць аб Вл. Коралі? Апавяданне «Наш полк» само па сабе крыху саладжавае і сантыментальнае. Ад Коралі хацелася-б больш мужнасці і строгасці ў выкананні, а тут яшчэ і музыка—элегічныя, слязлівыя мелодыі скрыпкі пад сурдзінку, віяланчалі... Вельмі ўжо пачуццёва, і тэма апавядання, цікавая і значная, раздрабляецца, бляднее. Добры ў выкананні Коралі «Савецкі характар». Шкада, што ў «Тачанцы», якую ён выконвае жвава, тэмпераментна, у імклівым тэмпе Коралі не заўважыў... грамадзянскай вайны.

Усё гэта салісты. А джаз?

Джаз-ансамбль Скамароўскага ўяўляўся іншым. Больш сыграным, рытмічным музыкальным. Дасканала гучыць у джазе медная група, разрознена, няўпэўнена—саксафоны, нязграбны ў тэхнічных месцах кларнеты. Ад скрыпак хацелася-б больш прыемнага, задушэўнага тону. Ад усяго ансамбля—мяккасці і стрыманасці ў акампаніменце. Шульжэнка, напрыклад, джаз яўна перашкаджае. Часам здаецца, што яна-б толькі выйграла ад выканання сваіх песень пад раяль. Салаўёва, якая валодае параўнаўча моцным голасам, не заўсёды можа перамагчы «медную стыхію» джаза.

Добра выканаў джаз-ансамбль «Песню Багунскага палка», горш—«Маю красуню», яшчэ слабей—«Украінскую фантазію». Лірычныя, шырокія і напеўныя украінскія народныя мелодыі выконваюцца, як неўрастэнічны блюз а украінскія «гапакі» — як вычварна надломленыя фокс ці румба.

Недастаткова ансамблевасці ў джазе, і гэта адчуваеш тым ясней, чым лепш выконвае сваю партыю Скамароўскі.

З канцэрта Уцёсава ідзеш з пачуццём, што было мала сыграна, хацелася-б паслухаць яшчэ некалькі нумараў; канцэрты Скамароўскага здаюцца зацягнуўшыміся за поўнач...

Канцэрты гэтых джазаў у Мінску арганізаваны Беларускай філармоніяй. За гэты час, апрача джазаў, былі канцэрты інструменталістаў, спевакоў, сімфанічнага аркестра—і даніць філармонію за захапленне джазамі не хочацца і не трэба.

Вл. ІЛЬІЧОЎ.

ТВОРЧАСЦЬ ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА

Пасля гістарычнага дня—семнаццатага верасня 1939 года—пачала бурна развівацца мастацкая самадзейнасць вызваленага народа Пры школах, сельскіх клубах, у гаражах, на фабрыках заходніх абласцей БССР пачалі стварацца дзесяткі і сотні мастацкіх гурткоў самых розных жанраў.

У дзесятках месц заходніх абласцей Савецкай Беларусі прайшлі масавыя алімпіяды мастацкай самадзейнасці і па іх можна меркаваць аб росквіце народнай творчасці, аб багатых крыніцах народных талентаў, аб сіле свабоднай песні.

Мястэчка Паставы Вілейскай вобласці. У ім на працягу трох дзён адбывался алімпіяда народнай самадзейнасці. У алімпіядзе прынялі ўдзел 630 спевакоў, танцораў, расказчыкаў, акрабатаў, дэкламатараў. Гэтая лічба гаворыць аб многім. Савецкі лад абуджае таленты, адкрывае перад імі шырокую творчую дарогу. На алімпіяду ў Паставы прыехалі народныя беларускія сказальнікі-паэты. З іх вуснаў ліліся прыгожыя, натхнёныя песні. Вось, што прачытаў Рыгор Антух—селянін вёскі Рамелькі:

Нам свеціць Сталіна прамень,
Дыхнулі вольна нашы грудзі.
Прышоў свабоды, шчасця дзень,
Цяпер і мы ўжо сталі людзі...

Міхаіл Асіненка, другі ўдзельнік алімпіяды, таксама чытаў свае вершы, якія заканчваліся так:

Эх ты, голуб сізакрылы,
Навучы мяне лятаць,
Ды не нізка, а высока,
Каб быў Сталін мне відаць.

Спявалі на алімпіядзе ў Паставах запісаныя ў той-жа вёсцы Рамелькі жывыя і бадзёрыя частушкі:

Мы пяём і веселімся,
Мы нікога не баімся,
Нас ніхто не зобідзе,
Нас бароніць СССР.

Сяляне вёскі Луцк паставілі на алімпіядзе п'есу з вельмі характэрнай назвай: «Хто нам асушыў слёзы». Напісаў гэту п'есу не прафесіянал-драматург, а сялянка Глафіра Самковіч і разыгралі гэту п'есу сяляне і сялянкі, многія з якіх не бачылі нават сапраўднага тэатра, і ігралі выдатна.

На алімпіяду прыслала вёска Савічы свой хор. Гэты хор па-майстэрску выканаў савецкія і народныя песні.

Поспех пастаўскай алімпіяды—не выключэнне. Таксама ярка і цікава прайшла алімпіяда мастацкай самадзейнасці і на Гродзеншчыне.

Поўнымі грудзьмі на ўвесь голас пяе вызвалены народ. Свабодны народ натхнёна творыць, развівае свае таленты.

Е. САДОЎСКІ.

ЛІТАРАТУРНЫЯ ВЕЧАРЫ У БЕЛАСТОКУ

Прыехаўшая ў Беласток брыгада рускіх і беларускіх пісьменнікаў правяла вялікую работу сярод мясцовых пісьменнікаў, а таксама па азнаямленню працоўных горада з дасягненнямі савецкай літаратуры. 13 студзеня ў гарадскім тэатры адбыўся вялікі літаратурны вечар. Тэатр быў перапоўнен. Паслухаць жывое слова паэтаў і празаікаў прышлі рабочыя фабрык, настаўнікі, урачы, служачыя, вучні школ. Па сутнасці гэта быў першы вялікі вечар савецкай літаратуры. Вечар адкрыў заг. аддзелам прапаганды і агітацыі гаркома КП(б)Б тав. Сенкевіч. З дакладам аб савецкай літаратуры выступіў тав. Кучар, які расказаў аб дасягненнях літаратур шматнацыянальнага Савецкага Саюза, аб росце культуры нашай краіны, аб творчасці раду пісьменнікаў.

З чыткай сваіх твораў на вечары выступілі: пісьменнік-ордэнаносец А. Первенцаў, паэты М. Галодны, А. Куляшоў, З. Аксельрод, П. Панчанка, А. Астрэйка, М. Груб'ян.

З вялікім уздымам прайшоў гэты цікавы вечар, які закончыўся канцэртам.

16 студзеня ў клубе партактыва адбыўся вечар сустрэчы прыехаўшых пісьменнікаў з пісьменнікамі горада. На творчай сустрэчы прысутнічала больш сямідзесяці пісьменнікаў. Выступалі тт. Кучар Галодны, Аксельрод, Лебедзеў, Марэўскі, Равіч, Дзегаль і іншыя.

18 студзеня быў арганізаван вялікі гарадскі вечар, прысвечаны XVI гадавіне з дня смерці Леніна. З чыткай твораў выступілі паэты Галодны, Куляшоў, Астрэйка, Панчанка. Даклад на тэму «Ленін у літаратурнай творчасці» зрабіў тав. Кучар. Пасля літаратурных выступленняў аркестр выканаў музычныя творы аб Леніне. У заключэнне вечара быў паказан фільм «Ленін у 1918 годзе».

М. БЛІСЦІНАЎ.

Беласток (па тэлеграфу).

ГАСТРОЛІ КАПЕЛЫ БАНДУРЫСТАЎ УССР

15 студзеня ў БССР прыехала Дзяржаўная ўзорная капела бандурыстаў Украінскай ССР у складзе 50 чалавек. За 15 год свайго існавання капела накапіла багаты рэпертуар песень народаў СССР.

Шырока прадстаўлена ў рэпертуары капелы ўкраінская народная песня—старажытная, лірычная, застольная і танцавальная.

Капела наведае Мазыр Бабруйск, Мінск і Віцебск, дзе дасць 8 канцэртаў.

ХРОНІКА

19 студзеня ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР адбылося пасяджэнне Урадавай камісіі па падрыхтоўцы дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Пасяджэнне адбылося пад старшынствам тав. Кісялёва.

На пасяджэнні быў разгледжан і абмеркаван макет афармлення оперы «Кветка шчасця», зроблены мастаком Л. Кроле.

Урадавая камісія зацвердзіла макет.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Б—1621.